Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!



# РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА

ВЫДАННЕ ЦК КП/б/Б

№ 2 ЛЮТЫ 1947

ВЫДАВЕЦТВА „ЗВЯЗДА“

# ГІМН СОВЕЦКАГА САЮЗА

Саюз непарушны рэспублік свабодных
З'еднала навекі Вялікая Русь.
Няхай жыве створаны воляй народаў,
Адзіны, магутны Совецкі Саюз!

Слаўся, Айчына ты наша свабодная,
Дружбы народаў апора і моц!
Сцягі совецкія, сцягі народныя
Хай нас вядуць па шляху перамог!

Праз буры свяціла нам сонца свабоды,
І Ленін вялікі нам шлях азарыў.
Нас вырасціў Сталін—на вернасць народу,
На подзвігі нас і на працу натхніў.

Слаўся, Айчына ты наша свабодная,
Шчасця народаў апора і моц!
Сцягі совецкія, сцягі народныя
Хай нас вядуць па шляху перамог!

Мы армію нашу расцілі ў змаганні,
Захопнікаў подлых з дарогі змяцем!
Мы лёс пакаленняў рашаем баямі,
Да славы Радзіму сваю павядзем!

Слаўся, Айчына ты наша свабодная,
Славы народаў апора і моц!
Сцягі совецкія, сцягі народныя
Хай нас вядуць па шляху перамог!

---

На вокладцы: малюнак мастака Н. Гуціева.


Слава першаму ўсенароднаму кандыдату
вялікаму СТАЛІНУ!

# УСЕ НА ВЫБАРЫ!

9 лютага 1947 года— знамянальны дзень для беларускага народа. Грамадзяне нашай рэспублікі будуць выбіраць дэпутатаў у Вярхоўны Совет БССР. Да гэтай даты, як да ўсенароднага свята, рыхтуюцца ўсе працоўныя. Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя ідуць на выбары з пачуццём найвялікшай удзячнасці партыі Леніна—Сталіна, якая сваім беззаветным служэннем народу заваявала ўсеагульную любоў, павагу і неабмежаванае давер'е сярод шырокіх мас працоўных.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна перамагла Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, створана совецкая ўлада. Дзякуючы мудрай палітыцы і правільнаму кіраўніцтву партыі наша краіна ператварылася ў перадавую і магутную соцыялістычную дзяржаву.

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі ўпершыню ў гісторыі наша Беларусь атрымала сваю дзяржаўнасць і дзякуючы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы ператварылася ў адну з перадавых совецкіх соцыялістычных рэспублік з развітай прамысловасцю і сельскай гаспадаркай.

У жыцці беларускага народа за час, які прайшоў з мінулых выбараў, адбыліся вялікія падзеі. Здзейснілася яго спрадвечная мара аб уз'яднанні ў адзіную совецкую дзяржаву. Пражыты цяжкія гады Айчыннай вайны.

Партыя большэвікоў як і ў перыяд мірнай творчай працы, так і ў суровыя дні вайны была выпрабаваным правадыром, натхніцелем і арганізатарам усіх перамог соцыялістычнай Радзімы. Створаны пад яе кіраўніцтвам «... совецкі лад аказаўся не толькі лепшай формай арганізацыі эканамічнага і культурнага ўздыму краіны ў гады мірнага будаўніцтва, але і лепшай формай мабілізацыі ўсіх сіл народа на адпор ворагу ў ваенны час» (Сталін).

Вялікую самаадданасць праявіў совецкі народ у барацьбе з чужаземнымі захопнікамі. Ён паказаў беззаветную любоў і адданасць да сваёй совецкай Радзімы, не шкадаваў ні крыві сваёй, ні жыцця свайго, адстойваючы вялікія заваёвы Кастрычніка. Самаадданай працай у тылу і ўдзелам у баях з ворагам совецкая жанчына дапамагла Чырвонай Арміі разграміць ворагаў і атрымаць вялікую перамогу.

Партыя аб'яднала ўсе сілы народа і накіравала іх да адзінай мэты—разгрому ненавісных захопнікаў. У гады цяжкіх выпрабаванняў народ аказаў вялікае давер'е і падтрымку большэвіцкай партыі, совецкаму ўраду, геніяльнаму палкаводцу Сталіну, якія прывялі нашу краіну да поўнай перамогі. У выніку гэтай перамогі яшчэ больш моцным і магутным вышаў з вайны Совецкі Саюз. Непераадольная сіла нашай дзяржавы—у соцыялістычнай эканоміцы, самай паслядоўнай соцыялістычнай дэмакратыі, у адзінстве нашага многанацыянальнага народа. Аднадушна падтрымліваюць і адабраюць палітыку партыі працоўныя нашай краіны і ў пасляваенны час.

На закліку партыі энергічна ўзяўся совецкі народ за аднаўленне разбуранай ворагам народнай гаспадаркі, як баявую праграму дзеяння ўспрыняў закон аб пяцігадовым плане і з поспехам ажыццяўляе задачы першага года новай сталінскай пяцігодкі.

Совецкая Беларусь, як і ўся наша краіна, ўпэўнена стала на шлях хуткага аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі. У першым годзе новай сталінскай пяцігодкі працоўныя нашай рэспублікі пры дапамозе брацкіх народаў Совецкага Саюза і ў першую чаргу вялікага рускага народа прарабілі велізарную аднаўленчую работу.

Прамысловыя прадпрыемствы Беларусі выканалі праграму 1946 года на 102 проценты. У мінулым годзе выпушчана прадукцыі у 1,8 раза больш, чым за 1945 год. У нашай рэспубліцы ўжо вырабляюцца сельскагаспадарчыя машыны, радыёпрыёмнікі, аўтапрыцэпы, шкло, цэмент, папера, запалкі і інш.

Да выбараў у Вярхоўны Совет партыя, як і раней, ідзе ў цесным саюзе, у адзіным блоку з беспартыйнымі рабочымі, сялянамі, інтэлігенцыяй. Блок комуністаў і беспартыйных паказаў сябе ў мінулых выбарах магутнай і непераможнай сілай. За гады Айчыннай вайны яшчэ больш узрос аўтарытэт нашай партыі, умацавалася дружба і адзінства совецкага народа.

Совецкі народ ведае, што, галасуючы за блок комуністаў і беспартыйных, ён будзе галасаваць за росквіт і магутнасць соцыялістычнай Айчыны, за свабоду і роўнапраўе народаў, насяляючых Совецкі Саюз, за далейшае ўмацаванне дружбы паміж народамі СССР.

Галасуючы за блок комуністаў і беспартыйных, выбаршчыкі будуць галасаваць за больш забяспечанае і культурнае жыццё, за шчаслівую і радасную будучыню нашых дзяцей.

Совецкія жанчыны, галасуючы за блок комуністаў і беспартыйных, будуць галасаваць за большэвіцкую партыю, совецкі лад, якія стварылі ўсе ўмовы для нябачанага культурнага і палітычнага росту жанчыны, для шырокага развіцця яе творчых сіл і здольнасцей; яны будуць галасаваць за шчаслівае мацярынства, радасць нашых дзяцей.

Дзень 9 лютага 1947 года з'явіцца ўсенародным святам працоўных, іх адзінства і згуртаванасці вакол партыі Леніна—Сталіна.

Няхай жыве блок комуністаў і беспартыйных!

Усе на выбары!

# У выбаршчыкаў

Н. КАЗАНЦАВА

У гэты дзень яшчэ раніцай адчувалася незвычайнае ажыўленне ў вёсцы Маляўка. Памяшканне сельскай школы набыло святочны выгляд: ля ўваходу зялянелі маладыя ёлкі, дзверы былі ўвіты піхтай, сцены таксама ўпрыгожаны гірляндамі зеляніны, плакатамі; у цэнтры—вялікі партрэт таварыша Сталіна і побач пераходны чырвоны сцяг, які атрыман калгасам імя Панамарэнкі.

Так выбаршчыкі 5-га выбарчага ўчастка Астрашыцка-Гарадоцкай выбарчай акругі рыхтаваліся да сустрэчы са сваім кандыдатам. К 12 гадзінам у школу пачалі збірацца выбаршчыкі. Прышлі калгасніцы сельгасарцелі імя Панамарэнкі: знатная звенявая комсамолка Яніна Корзюк, чыё звяно сабрала ў мінулым годзе багаты ўраджай збожжавых, лепшыя жывёлаводы — свінарка Ядзвіга Мінкевіч і даярка Ксенія Барадзенка, звенявая Жыдовіч.

З вясёлай песняй, з гармонікам прыехалі на некалькіх падводах выбаршчыкі суседняга калгаса імя Дзяржынскага. На першай падводзе ехалі перадавыя людзі сельгасарцелі—звенявыя Зіна Астроўская і Герасімовіч, даярка Ольга Савіцкая, стаханаўка паляводчай брыгады Софія Позняк і другія. Прасторны зал Маляўскай няпоўнай сярэдняй школы здаваўся цесным—сабралася каля 300 выбаршчыкаў.

З незвычайным уздымам прысутныя сустрэлі прапанову аб выбранні ў ганаровы прэзідыум членаў Палітбюро на чале з таварышом Сталіным.

Цёпла, гасцінна сустрэлі калгаснікі свайго кандыдата Марыю Барысаўну Осіпаву. Многія ведаюць і памятаюць яе. У дні нямецкай акупацыі тав. Осіпава працавала ў падпольнай арганізацыі і не адзін раз ёй даводзілася хавацца ад нямецкіх сабак у прыгарадах Мінска. У 1943 годзе, калі быў забіт нямецкі стаўленік душагуб Кубэ,—Осіпавай пагражаў арышт і яна доўгі час хавалася ў суседняй вёсцы Сталовая.

Затаіўшы дыханне, слухалі выбаршчыкі яе выступленне.



М. Б. Осіпава.

— Таварышы,—пачала сваю прамову тав. Осіпава. Я ад усяго сэрца дзякую вас за вылучэнне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Я абяцаю апраўдаць ваша давер'е, аддаць усе сілы і веды справе партыі Леніна — Сталіна, партыі, якая выхавала мяне, партыі, якая вучыць любіць народ, клапаціцца аб ім.

Далей яна коратка гаворыць аб сваім жыццёвым шляху, аб тым як яна з верасня 1941 года ўключылася ў падпольную работу і што за выкананне баявога задання ў тылу ворага ўрад удастоіў яе вышэйшай узнагароды—звання Героя Советскага Саюза.

— Жадаю вам, таварышы выбаршчыкі, плённай работы ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і яшчэ раз дзякую вас за аказанае мне давер'е,—закончыла сваё выступленне тав. Осіпава.

Дружнымі апладысментамі адказалі прысутныя на падзяку і пажаданне кандыдата. У сваіх выступленнях яны выказвалі ўпэўненасць, што тав. Осіпава апраўдае іх давер'е.

— Наш кандыдат тав. Осіпава,—гаварыла старшыня выбарчага ўчастка тав. Макеева,—верная дачка беларускага народа. Я заклікаю ўсіх аддаць свае галасы за Марыю Барысаўну Осіпаву.

Брыгадзір калгаса імя Панамарэнкі 60-гадовы тав. Крывічэнка запэўняў, што іх калгас у гэтым годзе збярэ ўраджай збожжавых 16 цэнтнераў з гектара.

— Мы аддадзім свае галасы за тав. Осіпаву і папросім яе цвёрда стаяць за справу Леніна—Сталіна, за народ, — гаварыў ён. — Няхай жыве і квітнее наша краіна совецкая! Няхай жыве доўгія гады наш Сталін!

Выступалі былыя франтавікі і партызаны. Яны гаварылі аб вялікіх выпрабаваннях совецкага народа ў гады вайны, аб цяжкасцях барацьбы з ворагам. І з задавальненнем адзначалі, што ў гэтай барацьбе актыўны ўдзел прымала тав. Осіпава. Іх цёплыя, усхваляваныя прамовы выбаршчыкі слухалі з вялікай увагай. Калгасніца тав. Ліхтаровіч выказала думкі ўсіх прысутных.

— Наш кандыдат тав. Осіпава,—сказала яна,—выканала тое, што ёй даручыла партыя. Яна не шкадавала сваіх сіл і здароўя. Таму я веру, што яна апраўдае наша давер'е. Мы не памылімся, паслаўшы яе ў Вярхоўны Совет рэспублікі!

У прамовах усіх выступаўшых на сустрэчы адчувалася любоў да Радзімы, да Сталіна, чыё імя заўсёды ўсяляе веру ў светлае будучае. І кожны даваў абяцанне працаваць так, як вучыць Сталін.

# Партыйны арганізатар

Г. СЯРГЕЕНКА

Ранішнюю цішыню парушаў роўнамерны гул матора. З-за ўзгорка вышаў трактар. Сталёвыя плугі адварачвалі роўныя пласты глебы. За рулём сядзеў трактарыст Васіль Лобан.

Толькі што ўзышло сонца. Усё навакол як-бы пазалацілася, ажыло. Трактарыст убачыў, што па дарозе крочыла жанчына. Прыгледзеўшыся, ён сказаў:

— Парторг ідзе. Не спіцца ёй.

На вавароце жанчына сустрэлася з трактарыстам. Гэта была Праскоўя Фёдараўна Салаўёва — парторг Цімкавіцкай МТС. На ёй ладна сядзела кароткая скураная куртка. Шэрыя вочы глядзелі спакойна, праніклёна.

— Расказвай, Васіль, як справы?

— Усё ў парадку,—адказаў трактарыст.—Хутка ў нас тысяча гектараў будзе.

— А слова сваё стрымаеш?

— Абавязкова!

Салаўёва падала трактарысту некалькі нумароў газет.

— Вось тут падкрэслена, — сказала яна,—абавязкова пачытай, напісана пра трактарыстаў Капыльскай МТС. Глядзі, каб яны не перагналі цябе.

— Няхай паспрабуюць, будзем з імі спаборнічаць,—адказаў Васіль.—А хто будзе пераможцам—убачым.

Развітаўшыся з трактарыстам, Салаўёва рушыла далей. Каля маладога сасонніку ёй сустрэліся шкілеты даўно згарэўшых аўтамашын. Гэта былі нямецкія аўтамашыны. Салаўёва спынілася, прыгледзелася. Ёй прыпомніліся мінулыя дні.

... Гэта было летам 1942 года. Пасля бою партызанскі атрад імя Панамарэнкі адпачываў. Раптам у лясным гушчары пачуўся дзіцячы плач. Праз некалькі хвілін вартавы прывёў у штаб дзяўчынку. Дзіця плакала, дрыжэла.

— Немцы ў вёсцы,—гаварыла дзяўчынка.—Майго татку схапілі... Кароў пазабіралі...

— Што рабіць?—звярнуўся камандзір атрада да жанчыны з аўтаматам.—Якая твая будзе думка, Праскоўя Фёдараўна?



П. Ф. Салаўёва.

— Прымем бой. Дадзім адпор гітлераўцам, каб запомнілі яны. Камуністы атрада не падвядуць.

— Падрыхтавацца да бою,— прагучэў загад.

Праз гадзіну партызаны сядзелі ў засадзе. Сярод іх была і Салаўёва. Чакаць доўга не прышлося. Аўтамашыны, напоўненыя немцамі, рухаліся на Вялікую Раёўку.

— Па ворагу агонь!

Залп, які чаргаваўся новымі залпамі, зрабіў сваю справу.

Бой хутка скончыўся. Ні адзін гітлераўскі бандыт не ўнік суровай кары народных мсціўцаў. Дзесяткі трупаў валяліся вакол спаленых аўтамашын...

Перад вачыма Праскоўі Фёдараўны ў памяці ўсплылі і многія іншыя баі, удзельнікам якіх яна з'яўлялася. Хіба можна забыць бой у Лаўскім лесе? Хіба можна забыць гарачыя схваткі з немцамі ў часе блакады? Партызанскі атрад, цэлы тыдзень і днём і ноччу адбіваючыся ад немцаў, прайшоў праз Капыльскі, Слуцкі, Грэскі, Любаньскі раёны, зрабіў 300-кіламетравы рэйс і вырваўся з варожага кальца. Стомленую, але заўсёды наперадзе атрада разам з камандзірам можна было бачыць і сакратара партыйнай арганізацыі Салаўёву. І заўсёды партызаны чулі яе ўпэўнены голас.

— Камуністы будуць ўперадзе.

... Адгрымелі баі. Партыя даручыла тав. Салаўёвай новы, адказны ўчастак работы. Яна ўзначаліла партыйную арганізацыю Цімкавіцкай МТС. І тут яна паказала сябе выдатным работнікам, сапраўдным арганізатарам мас.

Цімкавіцкая МТС у соцыялістычным спаборніцтве ў 1945 годзе заняла першае месца ў рэспубліцы. У рады пераможцаў МТС вышла і ў 1946 годзе. На кожны трактар выпрацавана каля 1000 гектараў умоўнага ворыва, зэканомлена больш 5 тысяч кілограмаў гаручага. Трактарысты Лобан і Шаравар выпрацавалі на сваім трактары больш 1.600 гектараў. Высокую выпрацоўку далі і трактарысты Сакалоўскі, Корсюк, Станіслаўчык, Янкоўскі і другія. Цяпер заканчваецца рамонт усіх трактараў і іншых машын. І ў полі, і ў майстэрні можна заўсёды бачыць парторга МТС тав. Салаўёву.

* * *

На сваіх перадвыбарчых сходах работнікі перадавой у рэспубліцы Цімкавіцкай МТС, калгаснікі сельгасарцелі «Піонер», Капыльскага раёна, і рабочыя Доктаравіцкага спіртзавода аднагалосна вылучылі Праскоўю Фёдараўну Салаўёву кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Цімкавіцкай выбарчай акрузе.

# Праслаўленая партызанка

М. ШЫФРЫНА

На сходзе рабочых і служачых промкамбіната, а таксама на сходах сялян вёсак Воранаўскага раёна, Гродзенскай вобласці, выбаршчыкі вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР Аляксандру Нікіфараўну Захараву. Вёскі гэтыя знаходзяцца далёка ад Мінска, дзе жыве і працуе Аляксандра Нікіфараўна, але жыхары яе добра ведаюць свайго кандыдата — праслаўленую партызанку, верную дачку Радзімы, чыё жыццё—яркі прыклад велізарнага росту савецкага чалавека, які вышаў з народа, выхаванага партыяй Леніна—Сталіна.

...У глухіх лясах загубілася сяло Верхатор, Верхаторскага раёна, у Башкірыі. Тут правяла дзяцінства і цяжкае юнацтва Аляксандра Нікіфараўна. Жыццё не песціла яе. Сямігадовай дзяўчынкай Шура страціла маці, а ў 13 год засталася круглай сіратой. Засталася не адна, а з двума малодшымі братамі і сястрычкай, якіх ёй трэба было выхоўваць.

Рана пазнала яна цяжар працы на гаспадара-кулака, рана пазнала вялікую нястачу. Адным павязло сіраце Шуры — здароўем і сілай. На рабоце яна была хуткая, спрытная. Нароўні з мужчынамі яна касіла, складала стагі, арала зямлю. І яшчэ выдзялялася яна ад аднавяскоўцаў сваёй задорнай весялосцю і вялікай жыццерадаснасцю. Бывала, зайграе гармонь і, не гледзячы на вялікую стомленасць, Шура не ўстаіць, каб не прайсці па кругу; песню завядзе—заслухаешся. «Добрая дзяўчына, ды бяздомная»,—гаварылі аб ёй у вёсцы.

У 17 год яе ўзялі замуж. Іменна ўзялі, таму што ні кахання, ні нават сватаўства не было. Прыехалі і вывезлі ў другую вёску, у вялікую сям'ю, дзе поўнаўласным гаспадаром была свякроў. Жанчына-самадур,—яна не магла дараваць нявестцы тое, што яна бяздомная сірата і бяспрыданіца. З першых-жа дзён пачала над ёю здзеквацца. Ад суму і гора, ад таго, што некаму было ў



А. Н. Захарава.

сям'і за яе заступіцца, Аляксандра Нікіфараўна цяжка захварэла і праз два гады яе зусім хворую вынеслі з дома на руках, паклалі побач дзіця і павезлі ў родную вёску.

Хоць далёка ў лясах загубілася сяло Верхатор, хоць было гэта толькі ў першыя гады савецкай улады, але і там знайшліся людзі, якія не далі загінуць адзінокай жанчыне. Яе з дзіцем прынялі на правах выхаванкі ў дзіцячы дом, які знаходзіўся тут-жа. Савецкія людзі не толькі выхадзілі яе, але падтрымалі маральна, прывілі вялікую любоў да ведаў, да навукі.

— Ты маладая яшчэ, жыццё тваё наперадзе, — гаварыла ёй загадчыца дзіцячага дома. Вучыся, у гэтым ты знойдзеш шчасце. І Шура з прагнасцю пачала вучыцца. Ледзь аправіўшыся ад хваробы, працуючы днём на кухні, яна да глыбокай начы заседжвалася над выкананнем заданняў сваёй настаўніцы—загадчыцы дзіцячага дома.

Шура аказалася здольнай вучаніцай, яна горача палюбіла кнігі і сур'ёзна пачала думаць аб далейшай вучобе. Хутка далучылася яна да грамадскай работы, стала актыўнай дэлегаткай. У 1926 годзе 22-х год уступіла ў комуністычную партыю, упорна і настойліва прадаўжаючы адначасова з работай вучобу. А праз тры гады ажыццявілася яе даўнейшая мара—яна стала студэнткай Пермскага педагагічнага інстытута.

... Вайна застала Аляксандру Нікіфараўну ў Крынкаўскім раёне, Беластоцкай вобласці. Будучы на партыйнай рабоце, яна прыехала сюды ў камандзіроўку па заданню абкома партыі. Тут яна ўжо ў першыя дні вайны ўбачыла браніраваныя полчышчы ўварваўшагася ворага. Тут адчула яна якое вялікае гора прынесла вайна савецкаму народу і асабіста ёй.

Разам з тысячным натоўпам рушыла Аляксандра Нікіфараўна на ўсход. Яна была адна і магла-б ісці хутчэй. Але ішлі мацеры з дзецьмі на руках, з рэчамі за плячыма, ішлі і валіліся ад стомленасці. І Аляксандра Нікіфараўна то ў адной, то ў другой жанчыны брала дзіця і дапамагала падносіць яго. А свой сын, любімы Жэня, застаўся дзесьці адзін. Што з ім цяпер? Куды ён падаўся? Ці жывы?—гэтыя думкі не давалі спакою.

Спробы прайсці лінію фронта не мелі поспеху. Аляксандра Нікіфараўна была комуністкай. Ужо ў дарозе яна думала аб тым, што трэба рабіць асабіста ёй у барацьбе з напаўшым на Радзіму ворагам. Пасля доўгіх

вандраванняў яна асела на правах бежанкі ў вёсцы Варатынь, Бабруйскага раёна. Тут праз некаторы час стварыла групу з комсамольцаў, настаўнікаў, урачоў вёскі. Група гэта праводзіла вялікую агітацыйную работу сярод насельніцтва, выкрывала ілжывую нямецкую прапаганду, усяляючы ўпэўненасць у перамогу Савецкай Арміі. Потым удзельнікі групы пачалі збіраць зброю, медыкаменты, выведваць размяшчэнне часцей. Работа праводзілася сурова канспіратыўна.

Вясной 1942 года Аляксандры Нікіфараўне ўдалося звязацца з партызанскім атрадам, а праз некаторы час яна і сама перайшла туды. Пазней у атрад перайшла ўся група падпольшчыкаў.

Яшчэ да вайны Аляксандра Нікіфараўна была лектарам абкома. Як прыгадзіліся яе веды і ўменне размаўляць з людзьмі на простай, даходлівай мове ў перыяд прабывання ў партызанах! Пагарджаючы небяспекай, яна чытала даклады для насельніцтва, часта нават у месцах размяшчэння нямецкіх гарнізонаў, і не было ў яе ва ўсё жыццё больш сур'ёзных, больш уважлівых слухачоў! У атрадзе яна таксама выкладала палітычныя дысцыпліны, а сама настойліва вывучала ваенную справу.

Неўзабаве Аляксандра Нікіфараўна была назначана камісарам палка, пазней рэарганізаванага ў брыгаду. Быць камісарам партызанскай брыгады—гэта вялікая, складаная работа, і не толькі выхаваўчая. Многа разоў прыходзілася самастойна рашаць складаныя баявыя задачы, ад вынікаў якіх залежала жыццё савецкіх людзей.

Аляксандра Нікіфараўна была для партызан і баявым камандзірам, і чуткім, адзыўлівым таварышам. Партызаны ведалі—у цяжкай абстаноўцы, у бядзе іх не пакіне камісар. Для кожнага яна знаходзіла жывое, падбадзёрваючае слова, мацярынскую параду. Яе гарачыя словы, цёплыя, шчырыя адносіны натхнялі людзей на барацьбу.

А часы былі цяжкія. У 1944 г. азвярэўшы сваімі няўдачамі на фронце вораг кідаў супроць партызан усё свежыя і свежыя сілы. Завязаліся цяжкія, крывапралітныя баі. У адным з такіх баёў Аляксандра Нікіфараўна была цяжка ранена.

Ужо лежачы ў Маскве ў шпіталі, даведалася яна аб радаснай вестцы—Указам урада СССР за баявыя заслугі ў барацьбе з нямецкімі захопнікамі яна была ўзнагароджана самай высокай узнагародай Савецкага Саюза — ордэнам Леніна. А праз некалькі месяцаў прышла другая радасць. Яе сын, яе Жэня жывы! Ён з пачатку вайны быў на фронце і добра біў праклятых немцаў. Аб гэтым сведчаць яго 7 урадавых узнагарод.

Пасля шпіталя Аляксандра Нікіфараўна вярнулася ва ўжо вызваленую Савецкую Беларусь і прыступіла да сваёй любімай лектарскай работы.

На ўсё жыццё запомніла яна і паездку сваю ў Югаславію летам 1945 года, будучы ў складзе савецкай дэлегацыі на антыфашысцкім жаночым кангрэсе. Яна сустракалася там з гераічнымі партызанамі Югаславіі. І хоць гаварылі яны кожны на сваёй мове, але добра разумелі адзін аднаго. Урад Югаславіі ўзнагародзіў жанчын савецкай дэлегацыі, у тым ліку і Аляксандру Нікіфараўну, вышэйшай узнагародай — ордэнам «Брацтва і адзінства».

Аляксандра Нікіфараўна працуе цяпер на адказнай рабоце ў апараце ЦК КП(б)Б. Яна з'яўляецца намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі. Прастата, скромнасць, гарэнне на рабоце—яе адметныя рысы.

Быць дэпутатам савецкага парламента — вялікая чэсць. Аляксандра Нікіфараўна Захарава па праву яе заслужыла.

***„...жанчыны складаюць палавіну насельніцтва нашай краіны, яны складаюць велізарную армію працы, і яны закліканы выхоўваць нашых дзяцей, наша будучае пакаленне, г. зн. нашу будучыню. Вось чаму мы не можам дапусціць, каб гэтая велізарная армія працоўных марнела ў цемнаце і невуцтве! Вось чаму мы павінны вітаць растучую грамадскую актыўнасць працоўных жанчын і іх вылучэнне на кіруючыя пасты, як несумненны прызнак росту нашай культурнасці".*** *(Сталін.)*

# *Народная артыстка*

## М. ВАГАНАВА

Народная артыстка БССР Ірына Фларыянаўна Ждановіч вылучана кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР па Чаўскай сельскай выбарчай акрузе.

Поезд пыхцеў і фыркаў, якбы напружваючы апошнія намаганні, падцягнуўся, вохнуў і стаў. Пасажыры з чамаданамі, клункамі, падштурхоўваючы адзін аднаго, мітусліва спяшаліся да выхаду.

З невялікім пацёртым чамаданчыкам у руцэ, Ірына лёгка саскочыла з падножкі вагона і, падхопленая патокам людзей, пайшла туды, куды ішлі ўсе.

Ірыну ніхто не сустракаў, і гэты незнаёмы вялікі горад палохаў сваёй таямнічасцю. Апынуўшыся на вялікай прывакзальнай плошчы і чакаючы трамвая, яна з цікавасцю і некаторай апаскай разглядала велізарныя дамы, галахліва аглядаючыся на аўтамабілі, якія імчаліся амаль няспынна.

«Не такой, зусім не такой уяўляла я сабе Маскву»,—з нескрываемай дасадай падумала яна. Усе радужныя ўяўленні Ірыны аб Маскве, тэатральнай студыі, аб казачнай будучыні амаль зніклі. Горад ёй здаўся суровым, халодным, нявэтлівым. На гэтай вялікай плошчы, сярод шырокіх непрывычных вуліц, высокіх будынкаў і кудысьці вечна бягучага натоўпу ёй стала страшна і... захацелася дамоў. Але Мінск быў далёка, ды і што падумаюць аб ёй?

З-пад кажушка, абцягнутага ўжо не новым сукном з «чортавай скуры», тырчаў клок аўчыны, недзе па дарозе незнарок адарванай. Галава была, як у старой, укутана хусткай. Маленькая і худзенькая—яна падобна была на цыплянё. Такой Ірына і з'явілася ў Маскоўскую тэатральную студыю.

— Вы, што-ж, дзетачка, талент маеце?—іранічна запытаў Ірыну педагог студыі на першым іспыце.



І. Ф. Ждановіч.

— Не ведаю, бацька гаворыць, што маю,—разгублена адказала яна, думаючы пры гэтым, што яе бацька—аматар і знаток сцэны—не мог памыліцца.

Але праблемы вялікага таленту, прызнацца, не так ужо моцна хвалявалі яе тады. Важней за ўсё ёй было падвучыцца і на сцэне абавязкова сыграць «Кацярыну» з п'есы А. Астроўскага «Граза»,—роль якой ужо тады захапляла яе дзіцячае ўяўленне.

Ірыне было да слёз крыўдна, што яна самая маленькая сярод студыйцаў і што яе ўсё яшчэ называюць «дзетачкай», калі ёй вось-вось споўніцца 15 год. Але пасля першых экзаменаў «цыплянё», як яе жартам называлі студыйцы, нібы вырасла. Ірыну больш не называлі «дзетачкай», у яе ўжо тады былі выяўлены прыродныя даныя, з якіх нараджаецца і вырастае талент актора.

Жыццё і вучоба ў студыі былі нялёгкімі. Над краінай яшчэ не паспеў развеяцца парахавы дым грамадзянскай вайны. Гэта быў цяжкі 1921 год, год пасляваеннай разрухі. Група студыйцаў-энтузіястаў, прыехаўшых з Беларусі, жыла ў халодным, неўпарадкаваным інтэрнаце; харчавацца прыходзілася таксама, як гавораць, чым бог паслаў. Але ніхто не сумаваў. Кожны вечар нямаведама адкуль паяўляўся хлеб, салёная, не заўсёды капчоная вобла, падмёрзлая бульба, павідла, а часам... і саланіна. Без «адрыву ад вучобы» Ірына ўмела з нічога прыгатаваць смачны абед, і, як вопытны «кулінар», у калектыве лічылася незамянімай гаспадыняй.

Дні праходзілі ў працы і вучобе. Цікаўная дзяўчынка прагна прыслухоўвалася да апавяданняў старых актораў, уважліва прыглядалася да іх ігры. Ірына ўсё больш пачынала разумець, што сапраўдным прызваннем актора з'яўляецца імкненне да майстэрства, да авалодання майстэрствам пераўвасаблення, уменне жыць на сцэне сапраўдным чалавечым жыццём.

Палюбіла Ірына Маскву і з адчуваннем лёгкага суму яна пакідала яе, ад'язджаючы ў свой родны Мінск.

... Мінскі тэатр у тыя гады ставіў незамысловатую п'есу «Стралок Тэль». Роль дзевяці-

гадовага Ганса—хлопчыка без слоў — запрапанавалі Ірыне. Хоць на сцэне яна была ўжо некалькі гадоў, гэтая роль нямала яе азадачыла. «Без дапамогі слоў стварыць вобраз, ды яшчэ хлопчыка, калі я ўжо дарослая дзяўчына»,—справа нялёгкая,—думала пра сябе Ірына, амаль гатовая адмовіцца ад ролі. Але ўпорства і настойлівасць узялі верх. Для Ірыны Жданові́ч наступілі дні ўпорнай работы, пачаўся працэс пераўвасаблення чалавека, яго характару, ператварэння дзяўчыны ў хлопчыка, дарослага ў дзіця.

— Што гэта з нашай Ірынай, стала нібы дзіця, і гаворыць па-дзіцячаму і ходзіць неяк упрыскокі,—жартаўліва гаварылі суседкі па дому.

І сапраўды, Ірына стала іншай. Яна крапатліва рабіла сваю роль не толькі на рэпетыцыях, яна ляпіла яе ў жыцці, вынашвала, жыла ёю заўсёды і ўсюды. А калі ў часе спектакля на сцэне паявіўся курносы, у шырокім капелюшы і з задорным выглядам хлопчык, у зале пачуліся адабрыцельныя воклічы. Ірына зразумела, што яны датычаць яе, і тады цвёрда рашыла, што ўсё яе будучае жыццё неад'емна ад гэтых падмосткаў, ад сцэны.

Можа ўдала сыграная першая роль, а можа страсная любоў да дзяцей вызначылі асаблівую цягу Ірыны Фларыянаўны да роляў падлеткаў. На сцэне беларускага тэатра яна стварыла цэлую галерэю незабыўных дзіцячых вобразаў.

Ірына Жданові́ч валодае рознастайным талентам. Артысткай створаны яркія, высокамастацкія вобразы жанчыны ў рускім і заходнееўрапейскім класічным рэпертуары, з прэдзельнай паўнатой і рэальнасцю раскрыты характар, благародства душы, сіла і хараство пачуццяў рускай жанчыны. Такой Ірыну Жданові́ч бачыў глядач у ролях: Людмілы («Позняе каханне» А. Астроўскага). Насты («Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка), Машы («Капітанская дачка» А. Пушкіна), Веры («Апошнія» М. Горкага) і іншых.

Глыбіня таленту Ірыны Ждановіч найбольш ярка раскрылася ў створаным ёю складаным вобразе Джульеты ў класічнай трагедыі В. Шэкспіра «Ромэо і Джульета». Джульета—гэта вобраз жанчыны мінулых стагоддзяў. І Ждановіч па-майстэрску здолела раскрыць сілу і чыстату пачуццяў сваёй гераіні, зрабіць сваю Джульету праўдзівай, даходчывай і зразумелай сучаснаму гледачу. У гэтай ролі яна выступіла ў знамянальныя дні, калі ёй і Беларускаму Дзяржаўнаму ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга драматычнаму тэатру імя Янкі Купалы споўнілася 25 год творчага жыцця.

Чвэрць века на сцэне—вялікая частка жыцця. Для артысткі Ждановіч гэта—нараджэнне, станаўленне і расквіт таленту. Гэта шлях ад Данілкі да Людмілы, ад Юркі да Машы, ад Веры да Джульеты. І што ні вобраз—то характар, пасвойму складаны, другі—не падобны на першы. Адно, што роднiць вобразы, створаныя Ірынай Фларыянаўнай,—гэта іх праўдзівасць, жыццёвасць. Глядач разам з актрысай жыве жыццём яе герояў, разам з імі любіць, пакутуе, змагаецца, перамагае. Яе вобразы жывуць на сцэне таму, што яны сапраўды народныя, сатканыя з найдрабнейшых частачак, падмечаных, абагуленых і дасканала адабраных з шматграннага жыцця народа, яго характару, яго лепшых рысаў. Таму яны такія блізкія і зразумелыя самаму шырокаму і рознабаковаму гледачу і маюць глыбокае пазнавацельнае і выхаваўчае значэнне.



9 лютага 1947 года Надзя Сянько — наборшчыца друкарні імя Сталіна (г. Мінск)—упершыню ў сваім жыцці будзе ўдзельнічаць у выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР. Маладая стаханаўка комсамолка Сянько ўзяла абавязацельства ў чэсць выбараў выконваць план не ніжэй чым на 125 проц. Сваё абавязацельства яна перавыконвае.

**На здымку: Надзя Сянько.**

Фота **А. Дзітлава.**

Талент актрысы, яе творчае майстэрства і працавітасць дастойна ацэнены ўрадам СССР і ўрадам нашай рэспублікі. Яшчэ ў 1940 годзе ў часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве Ірына Фларыянаўна ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Урад БССР прысвоіў ёй высокае званне народнай артысткі БССР. Гэта высокая ацэнка заслуг перад народам артысткі і ўсяго калектыва выдатнага тэатра, на сцэне якога яна выхавалася і пры дапамозе якога вырасла і расцвіло яе творчае дараванне.

Народная артыстка! Што можа быць больш выдатным у жыцці актора? У гэтых двух словах выражана самае вялікае і дарагое—талент артыста прызнаны народам! Калі-ж гаварыць аб народнай артыстцы Ждановіч, то яе жыццё і творчая дзейнасць—найбольш яркі прыклад неразрыўнай, арганічнай сувязі мастацтва з народам. Яе незвычайны талент нарадзіўся, мужнеў і расцвітаў на аснове глыбокага вывучэння і абагульнення жыццёвага вопыту, мудрасці народнай, яго культуры. Яму—народу—яна і аддае сваё дараванне.

Сувязь Ірыны Фларыянаўны з народам не абмяжоўваецца сцэнай. Ірына Фларыянаўна—добры грамадскі дзеяч, яна актыўна ўдзельнічае ў партыйным і грамадскім жыцці калектыва, дапамагае тэатру расціць і выхоўваць новыя творчыя кадры. Пастаянная сувязь з народам, разуменне і блізасць яго інтарэсаў і патрэб, прастата і скромнасць з'яўляюцца цудоўнымі рысамі характару народнай артысткі БССР Ірыны Фларыянаўны Ждановіч, дастойна ацэненымі народам.

# Знатная трактарыстка

**Ал. ШАРАПАЎ**

За акном ледзь світала, а Хрысціна ўжо была на нагах. З таго часу, як даручылі ёй, трактарыстцы Хрысціне Козыравай, загадваць майстэрняй МТС, уставаць даводзілася раней звычайнага. Адна справа была за сваім трактарам глядзець. А тут увесь парк! І ўлічыць трэба, у якім рамонце кожны трактар адчувае патрэбу. І рабочых расставіць. І інструмент загадзя падрыхтаваць. А галоўнае апраўдаць давер'е хочацца, не падвесці МТС у такі момант, калі заявіла яна на ўсю рэспубліку аб тым, што рамонт трактараў і сельскагаспадарчага інвентару скончыць да дня выбараў у Вярхоўны Савет БССР.

Спяшалася сёння Хрысціна і па другой прычыне. Вось ужо некалькі дзён падрад, у вольны ад сваіх асноўных абавязкаў час, дапамагае яна рамантаваць трактар комсамолцы Варвары Ашывілавай. На гэтым трактары працавала мінулы год сама Хрысціна. І хочацца ёй, каб з такой-жа славай прайшоў ён у новым годзе па калгасных палях, пад вадзіцельствам маладой трактарысткі.

— Няўжо зноў так рана пойдзеш,—аклікнула з кухні Хрысціну маці, якая завіхалася ля печы,—прышла позна, ідзеш рана. Ох, ужо мне...

— А сама, нябось, таксама рана ўстала, — усміхнулася Хрысціна, добра ведаючы, што ў бурчэнні мацеры скрыта шчырае хваляванне за справы МТС, дзе працуе яе дачка.

Ды і як не хвалявацца! Што ні кажы, а Калінаўская МТС заняла ў рэспубліцы першае месца. У МТС справы добрыя, — значыць і ў калгасе добрыя будуць: учас узарана, учас засеяна і ўбрана. А тут яшчэ дачка на ўсю Беларусь праславілася. Кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларускай рэспублікі вылучаюць.

Ці марыла Варвара Якаўлеўна бачыць у такім пачоце дачку, сама ў яе гады ведаўшая адну бабскую дарогу: «ад печкі да парога».

— Ладна, садзіся ўжо, снедай...



Х. М. Козырава.

Па дарозе кружыць сухі снег. Да МТС—поўгадзіны ходу. Чорнымі плямкамі выглядаюць здалёку пабудовы МТС. Здаецца, і нямнога гэтых пабудоў, а колькі працы каштавала людзям, каб адбудаваць іх на папялішчы за два з невялікім года.

Багатай была Калінаўская МТС да вайны. Кузню каменную мела, кладовую, гараж, дзве павеці, тры дамы жылыя, трактараў адных 30, ды 5 аўтамашын. Дашчэнту спалілі яе нямецкія захопнікі. Вывезлі з сабой трактары і машыны. І калі ў дні вызвалення прышлі хто адкуль на вызваленую зямлю старыя трактарысты, то знайшлі на месцы былой МТС цыстэрну, ды і то прастрэленую наскрозь.

Пачалі з таго, што выцягнулі з ракі затануўшы трактар, адрамантавалі. Узаралі ім першыя 120 гектараў. Да будаўніцтва прыступілі.

Разам з мужчынамі вывозіла Хрысціна з лесу бярвенні. Днём і ноччу працаваў калектыў па аднаўленню роднай МТС. Новую кузню пабудавалі, новую кладовую і майстэрню, новыя жылыя дамы. Толькі трактараў было мала. Сабралі іх па лясах — дзе матор, дзе раму. Усяго 8 трактараў мела МТС на 1945 год.

Вось тады і задумалася Хрысціна Козырава над тым, як дапамагчы Радзіме ў цяжкія дні станаўлення, як прымусіць адзін трактар працаваць за гры і чатыры. Мала, рашыла яна, умець кіраваць машынай, трэба так авалодаць ёю, каб у любы момант, у любых умовах здолець знішчыць якую ўгодна непаладку без дапамогі механіка. Колькі разоў за сваю практыку прыходзілася бачыць Хрысціне, як топчацца гадзінамі які-небудзь хлапец або дзяўчына каля трактара і не ў стане прывесці яго ў паслухмянства. Не раз адчувала гэта і сама яна. А ці-ж не адсутнасць належных ведаў з'яўляецца часта першапрычынай усялякіх промахаў і аварый?... Не, не такім павінен быць трактарыст. Гаспадаром поўнаўласным сваёй машыны павінен быць ён, каб па аднаму шуму матора вызначыць, што і як. А гэта тым больш неабходна, што трактары пасля нямецкага разбойнічання часткамі збіраліся.

Нямалы вопыт мае Хрысціна. Сем год за рулём. 17-гадовай дзяўчынай прышла яна ў Калінаўскую МТС. Адной з першых скончыла курсы трактарыстаў, на камбайне два гады працавала. І ўсё-такі не магла заявіць, што можа лічыць сябе такой трактарысткай. Вучыцца трэба.

І Хрысціна пачала вучыцца. Часта людзі бачылі яе ў зімовыя вечары за кнігай. Вылічвала, практыкай вывярала. Чаго зразумець не магла, у механіка і дырэктара пыталася. З іншымі трактарыстамі раілася. І свайго дабілася.

# Шчасце служыць народу

Л. ДЗЕМЯХ

У нашай вёсцы Острава, Гродзенскай вобласці, жылі выключна беларусы. На кожным кроку нам даводзілася цярпець крыўду і знявагу. Вучыцца нельга было, на роднай мове і слова не скажаш. Збярэмся бывала ўвечары ў каго-небудзь з аднавяскоўцаў і адна думка ва ўсіх: ці доўга мы будзем пад такім прыгнётам, дакуль так прадаўжацца будзе?

Час вызвалення прышоў у 1939 годзе. Зара свабоды заззяла над намі. Цяжка апісаць нашу радасць. Памятаю, як Чырвоную Армію—сваю вызваліцельніцу з кветкамі, хлебам і соллю сустракалі.

Неўзабаве ў раённым цэнтры Саколкі былі арганізаваны курсы совецкага актыва. Паслалі на курсы і мяне. Цяжка было вучыцца, але я імкнулася пачэрпнуць як мага больш ведаў. Калі скончыла курсы, паехала ў сваю вёску. Была агітатарам, потым пачала працаваць старшынёй пасялковага совета. А ў 1940 годзе сяляне вёскі Траянаўка, Дамброўскага раёна, выбралі мяне дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

На мяне ўскладаліся вялікія абавязкі, я-ж павінна з'яўляцца на месцы прадстаўніком нашай вярхоўнай улады.

У пачатку вайны я дапамагла многім жыхарам пасёлка



Л. Дземях.

эвакуіравацца ў совецкі тыл. Людзі, якія пазналі ўсю радасць і шчасце свабоднага жыцця, не хацелі зноў адчуць на сабе страшэнны прыгнёт. Разам з імі эвакуіравалася і я.

У глыбокім тылу мне давялося быць на розных работах. Але я лічыла, што маё месца—у радах воінаў Чырвонай Арміі, што разам з імі я павінна адстайваць тыя вялікія правы, якія нам, працоўным заходніх абласцей Беларусі, дала родная совецкая ўлада. Я папрасілася за лінію фронта. І праз некаторы час—у верасні 1942 года—ужо была байцом партызанскага атрада імя Кірава, потым—старшыной, камісарам.

Як толькі Чырвоная Армія пачала вызваляць нашу зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, я адразу-ж паехала ў родныя мясціны. Мяне назначылі намеснікам старшыні Дамброўскага райвыканкома. І калі немцы былі яшчэ на ўскраінах Дамброва, мы арганізавалі ўжо 13 сельсоветаў. Зноў вярнулася жыццё на беларускую зямлю. Адкрыліся школы, клубы, дамы соцкультуры.

Я лічу найвялікшым для сябе шчасцем служыць свайму народу, бо няма ў мяне больш высокіх інтарэсаў, чым інтарэсы народа. Да гэтага абавязвае мяне высокае званне члена комуністычнай партыі.

Цяпер я працую загадчыкам аддзела Гродзенскага райкома партыі па рабоце сярод жанчын. Поле дзейнасці ў мяне надзвычай вялікае. Хочацца далучыць усіх жанчын да актыўнага палітычнага і грамадскага жыцця. З гэтай мэтай ва ўсіх сельсоветах мы арганізавалі жаночыя советы, усюды выбралі дэлегатак. Значна павысілася актыўнасць жанчын. Дастаткова сказаць, што 108 жанчын вылучаны ва ўчастковыя камісіі па выбарах у Вярхоўны Совет БССР, 11—у акруговыя камісіі, многія працуюць агітатарамі. Гэта, вядома, толькі пачатак той вялікай работы, якую нам належыць правесці.

З велізарным хваляваннем даведалася я аб тым, што сяляне вёскі Баранава, Навасёлкаўскага сельсовета, і вёскі Капцёўкі, Капцёўскага сельсовета, зноў вылучылі мяне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Прыкладу ўсе сілы да таго, каб апраўдаць іх давер'е, выканаць свой абавязак перад Радзімай.

---

У 1945 годзе Хрысціна Козырава сапраўды прымусіла працаваць свой «У-2» бадай як «НАТИ», выпрацаваўшы каля трох норм. А ў мінулым годзе яе «ХТЗ» працаваў за пяць трактараў. І трэба прама сказаць, ні разу за ўвесь год не спатрэбілася Хрысціне дапамога механіка. «Безаварыйным» празвалі яе трактар, на якім узарала яна 1394 гектары, зэканоміўшы пры гэтым 4175 кілаграмаў гаручага. Як адной з лепшых трактарыстак упамінаецца яе імя ў пастанове Совета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б па выніках соцыялістычнага спаборніцтва МТС.

Але не адно, зразумела, веданне тэхнікі вызначыла поспех трактарысткі. Любоў да Радзімы, вялікае жаданне ўбачыць яе як мага хутчэй багатай і квітнеючай натхняла Хрысціну Козыраву на працоўныя подвігі. І як рада яна, што таксама высокіх поспехаў дабіліся і другія трактарысты яе МТС. Нямногім менш Хрысціны выпрацаваў на ХТЗ трактарыст Смоляр. 2708 гектараў узараў на «НАТИ» Скубілаў. І ўжо, зразумела, не можа гаварыць без хвалявання Хрысціна Козырава аб поспеху вучня свайго, раней працаваўшага ў яе падручным, Грыгорыя Крывіцы, выканаўшага пры самастойнай рабоце 428 процантаў плана.

Што казаць, добра папрацавала Калінаўская МТС. Недарма ў чырвоным кутку канторы стаіць пераходны чырвоны сцяг Совета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б.

# Жамчужына народнай творчасці

Ф. РОГАВА

Сяло Вялікае Падлессе, Баранавіцкай вобласці, нічым не адрозніваецца ад многіх іншых сёл і вёсак заходніх абласцей Беларусі. Але яно шырока вядома не толькі ў рэспубліцы, а таксама і далёка за яе межамі,—у сталіцы нашай Радзімы—Маскве. У сяле гэтым знаходзіцца выдатны сялянскі хор, звонкія песні якога не раз гучэлі як са сцэн беларускіх тэатраў, так і Вялікага Дзяржаўнага тэатра Масквы.

Хор сяла Вялікае Падлессе мае сваю гісторыю. Ён нарадзіўся разам з прышоўшай свабодай у 1939 годзе. Народ заходніх абласцей Беларусі пасля вызвалення ад панскага прыгнёту ўпершыню заспяваў ва ўвесь голас. Заспявала і Вялікае Падлессе. Удзельнікі хора—гэта сяляне-хлебаробы. Разам з сабой яны прынеслі ў хор сапраўды народныя песні—песні, дайшоўшыя ад дзядоў і прадзедаў, песні, у якіх глыбока і красамоўна адлюстраваны пачуцці, мары, духоўная сіла, мудрасць народная.

Загучэлі песні ва славу таго, хто прынёс шчасце народу, ва славу вялікага Сталіна:

«Песні радасці пяем
маладзецкія —
Не чужацкія, ліхія,
а савецкія.
Шчаслівейшыя з усіх людзі
сталі мы.
Дзякуй шчырае ад нас шлём
бацьку Сталіну!»

Песня стала патрэбнасцю сялян Вялікае Падлессе. Дзяўчаты, хлопцы, нават пажылыя «дзядзькі» збіраліся запроста ў дамах, на вечарах, за аколіцай, у школе і спявалі—спявалі і складалі новыя песні. Ініцыятарамі гэтых збораў была моладзь сяла—Оля Федчык, Надзя Іваноўская, Фядора Булка, Вера Кумейша, Вера Петух і многія другія. Бадзёрыя, энергічныя, ініцыятыўныя, не ведаючы стомленасці ў працы і ў весялосці,—яны збіралі аднасяльчан «спяваць». І вельмі часта ў летнюю пару, калі пераваліць далёка за поўнач і на небе патухнуць апошнія зоркі, над сялом яшчэ раздаецца песня—дружная, калектыўная, часам гучная, часам ціхая. Гэта значыць, у хаце-чытальні ідзе рэпетыцыя.

У складзе хора большасць жанчын. Жанчыны—гэта ядро хора, яго аснова. Па сутнасці яны і ствараюць гэтыя чароўныя мелодыі народных спеваў. Запявваламі выступаюць Надзежда Іваноўская, Ганна Кумейша, Маня Смаршчок, вядучыя падгалоскі—Булко Фядора, Вера Новік, Наля Шклянік. У хор прышлі нават цэлыя сем'і. Валя Шахмуць, напрыклад, спявае ў хоры разам са сваім пяцідзесяцігадовым бацькам Іванам Ільічом і сястрой Ленай.

Пяцідзесяцігадовы гарманіст Шахмуць Андрэй аддае хору ўсё сваё музычнае дараванне. Ён не толькі суправаджае песні і танцы, але і сам стварае народную музыку.

Хорам кіруе малады беларускі этнограф Генадзій Іванавіч Цітовіч. З якой любоўю ён адносіцца да гэтай справы! Генадзій Іванавіч добра ведае беларускую народную песню і музыку. Ён імкнецца данесці яе да слухачоў такой, якой яна спяваецца ў народзе,—сапраўды народнай, рэалістычнай. Удзельнікі хора спяваюць песню так, як яны яе адчуваюць самі. Яны ўносяць у выкананне шчырасць, непасрэднасць, праўдзівасць, музыкальнасць. Незабыўнае ўражанне пакідае выкананне песень «Дзяўчынанька», «Шуміць гай», «Ой, рэчанька, рэчанька», «Павей ветру», «Ажанілі мяне малалетняга» і іншыя.

Чароўныя мелодыі гэтых песень міжвольна пераносяць ваша ўяўленне ў поле; вы нібы бачыце, як на закаце сонца з сярпамі цераз плячо жнеі вяртаюцца дамоў. Або вы адчуваеце цішыню беларускіх палёў, пахучы арамат сасновага бору, звонкае шчабятанне птушак, спакойнае цячэнне серабрыстай рэчанькі. Усё гэта знаёма, блізка і дорага нам. Іменна так успрыймаюцца песні хора сяла Вялікае Падлессе.

У жыцці хора ёсць незабыўныя дні. У 1940 годзе на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве яго слухаў Сталін. Натхнёныя ўвагай правадыра да творчасці народа, хор перадаў праз песню сваю ўсё тое дарагое, што было звязана з іменем Сталіна. Хору давялося выступаць у Маскве на сцэне Вялікага Дзяржаўнага Акадэмічнага тэатра і яшчэ раз у 1945 годзе на Усесаюзным аглядзе мастацкай самадзейнасці. Тады гэты хор быў названы жамчужынай народнай творчасці.

У гады, калі страшэнным няшчасцем абрушылася на нашу краіну вайна, у Вялікім Падлессі змоўклі гучныя песні. Многія ўдзельнікі хора пайшлі на фронт. Нямецкія каты жорстка праследвалі ўдзельнікаў хора. Фашысцкія вылюдкі расстралялі яго старасту Васілія Паўлавіча Петух і Фёдара Баўтрукевіча.

Але як толькі скончылася вайна, песня зноў зазвінела ў сяле Вялікае Падлессе. У ёй народ выражае сваю ўдзячнасць Сталіну за вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

«Праз цябе, наш родны
Сталін,
Мы свабоднымі зноў сталі,
Вольна, шчасліва жывём
І табе падзяку шлём...»

(Словы з песні «1944 год», якую склаў гарманіст хора Шахмуць Андрэй.)

У хор вярнуліся франтавікі—былыя яго ўдзельнікі. Разам з сабой яны прынеслі новую песню, жывы струмень энергіі, бадзёрасці, баявы дух.

Значна ўзбагаціўся пасляваенны рэпертуар. Выконваюцца сучасныя песні: «Падзяка таварышу Сталіну», «Пінская партызанская» і інш.

Песні хора сяла Вялікае Падлессе выходзяць далёка за рамкі мясцовага значэння. Не гледзячы на тое, што большасць песень запісана ў сяле і яго ўскраінах, па свайму характару, тэматыцы, яны тыповыя для нашай Беларусі.

Хор сяла Вялікае Падлессе з'яўляецца сапраўднай жамчужынай народнай творчасці.



**На здымку:** выступленне хора ў Маскве ў Вялікім тэатры.

# За самага роднага чалавека

## О. КНЮКШТО

Мне 53 гады. Усё сваё жыццё я пражыла ў Мінску. Тут я нарадзілася, вырасла, вышла замуж. І тут я вырасціла і выхавала сваіх дзяцей. У мяне 5 сыноў і 2 дачкі. Муж мой Кнюкшто Аляксандр Осіпавіч—стары рабочы завода імя Кірава. Да вайны ён быў майстрам у цэху, а цяпер навучае моладзь у школе ФЗН пры заводзе.

Памятаю, нарадзілася ў нас першая дачка ў 1910 годзе. Разам з радасцю прышлі і клопаты: як яе выхаваць, навучыць. Ведала я, што для яе, дачкі рабочага, не адчыняцца дзверы гімназіі, што не хопіць у нас сіл аддаць яе ў пансіён. Ды ці прымуць? Толькі багацеі маглі тады вучыць грамаце сваіх дзяцей, а мы, простыя людзі, павінны былі рыхтаваць сваіх сыноў і дачок толькі для чорнай работы. Як мне, маці, было цяжка і балюча бачыць гэтае бяспраўе!

І як радасна на сэрцы цяпер, калі я гляджу на сваю сям'ю. Пры савецкай уладзе дзеці мае вышлі ў людзі: Елена працуе хімікам-тэхнолагам, Нікалай — механікам, Міхаіл — майстрам, Георгій—афіцэр Совецкай Арміі.

Вялікія правы атрымалі працоўныя ад совецкай улады. Гэтыя правы запісаны ў нашай Канстытуцыі, якая носіць імя вялікага чалавека—Сталіна.

Як толькі пачалася вайна, тры маіх сыны сталі на абарону сваёй Радзімы, сваіх правоў, на абарону совецкай улады. Муж эвакуіраваўся ў глыбокі совецкі тыл і там прадаўжаў дапамагаць Радзіме сваёй працай. З ім працаваў малодшы сын—Лёва.

Я па стану здароўя не магла тады выйсці з Мінска, і сын Пётр застаўся са мною. Але ці мог 18-гадовы юнак глядзець спакойна на бясчынствы немцаў, на іх дзікую расправу з насельніцтвам? Пеця пайшоў у партызанскі атрад.

Доўгімі бяссоннымі начамі я з трывогай думала аб сваіх дзецях, аб мужу. Але ведала, што чырванець за іх не прыдзецца, што яны чэсна служаць Радзіме, чэсна абараняюць совецкую ўладу. І ўсім сэрцам сваім я верыла ў тое, што Совецкі Саюз пераможа, што ворагі будуць выгнаны з нашай зямлі. Верыла таму, што ведала—Сталін не пакіне народ у бядзе.

І вось прайшлі цяжкія гады вайны, гады разлукі. Гляджу я на сваю сям'ю і ва ўсім бачу вялікія клопаты ўрада, бачу, як дапамагае наладзіць жыццё народу совецкая ўлада і партыя Леніна—Сталіна.

Я, маці семярых дзяцей, узнагароджана ордэнам «Материнская слава III степени». Хіба ў іншай якой-небудзь краіне так клапоціцца дзяржава аб мацерах? Не! Дзеці ў мяне працуюць і маюць магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю. Мужа майго цэняць і паважаюць.

Калі я даведалася, што таварыш Сталін даў сваю згоду балатыравацца па нашай выбарчай акрузе, радасна і светла стала на сэрцы. Я і ўся мая сям'я маем шчасце аддаць свае галасы за таварыша Сталіна, за самага роднага для нас чалавека.

# *Аляксандр Сяргеевіч Пушкін*

**(Да стадзесяцігоддзя з дня смерці)**

**Н. ГЛЕБКА**

Сто дзесяць год таму назад, 10 лютага 1837 года, у Пецярбургу трагічна загінуў вялікі рускі паэт Аляксандр Сяргеевіч Пушкін. Забіты з ведама і па ўказцы рускага царызма, паэт быў аплаканы ўсім перадавым грамадствам. Слава аб ім прайшла праз вякі і стала здабыткам усіх народаў. Ён блізкі і дарагі нам таму, што, праўдзіва і ярка адлюстроўваючы найбольш характэрныя і важныя моманты тагачаснага жыцця, услаўляў свабоду і клікаў на змаганне з няпраўдай і злом.

«И долго буду тем любезен я народу,
Что чувства добрые я лирой пробуждал,
Что в мой жестокий век восславил я свободу
И милость к падшим призывал».

**(«Памятник».)**

Аляксандр Сяргеевіч Пушкін нарадзіўся ў Маскве 26 мая (па старому стылю) 1799 года ў сям'і радавітых дваран. Але не толькі побыт дваран бачыў і ведаў будучы паэт. Ён з увагаю прыглядаўся да ўсяго навакольнага і не мог не заўважыць бяспраўнага жыцця прыгоннага народа. Аб гэтым жыцці шмат цікавага апавядала яму яго нянька Арына Радыёнаўна. Яна навучыла яго бачыць цяжкую долю паднявольнага рускага народа, абудзіла ў ім цікавасць і любоў да яго.

Калі Пушкіну было 12 год, ён паступіў вучыцца ў Царскасельскі ліцэй. Там ён упершыню пазнаёміўся з нелегальнай тагачаснай літаратурай і ўспрыняў свабодалюбівыя думкі перадавых людзей. Пад уплывам гэтых новых ідэй у ім расце нянавісць і пагарда да нікчэмнага бляску вялікасвецкага жыцця, пачуццё абурэння супроць пышнасці царскага двара і імкненне да ўсяго прагрэсіўнага і свабоднага.

Вершы, напісаныя Пушкіным за час прабывання ў ліцэі, робяць яго вядомым не толькі сярод ліцэістаў, але і сярод буйнейшых пісьменнікаў таго часу. Гэтыя раннія творы былі перш за ўсё песнямі любві і радасці. Яны прасякнуты глыбокім аптымізмам і сцвярджэннем жыцця, якое было для Пушкіна заўжды цудоўным, светлым і прывабным.

Матывы ўслаўлення жыцця мы знаходзім і ў вершах пазнейшых гадоў. Але ў гэты час перад намі ўжо не бесклапотны юнак, а чалавек, які навучыўся шмат чаму, які ўбачыў і адчуў жыццё такім, якім яно было ў сапраўднасці: поўным глыбокіх супярэчнасцей і пакут. І сваё прызнанне, як паэта, Пушкін бачыць ужо не толькі ў тым, каб «пленять ум и разгонять печали», але і ў тым, каб указваць «милой жизни светлу даль».

Вызначыўшы, такім чынам, задачу паэзіі як служэнне грамадству і яго барацьбе за культуру, за свабоду і прагрэс, Пушкін да канца застаецца верны сваім ідэалам. Ён смела становіцца на шлях выкрывання існуючага соцыяльнага ладу і стварае цэлы шэраг палітычных свабодалюбівых вершаў і вострых эпіграм. Так, напрыклад, у вершы «Сказки» паэт злосна высмейвае канстытуцыйныя абяцанні Аляксандра І, называючы яго дэспатам. Хутка гэты сарказм перарастае ў творчасці Пушкіна ў магутны гнеў, які накіраваны супроць усіх «тиранов мира» і гучыць як заклік да паўстання.



А. С. Пушкін.

«Тираны мира! трепещите!
А вы, мужайтесь и внемлите,
Восстаньте, падшие рабы!»

Паэт бязлітасна выкрывае самаўладства і прыгонны лад і падае яркія і жудасныя малюнкі жыцця, дзе:

«Везде бичи, везде железы,
Законов гибельный позор,
Неволи немощные слезы;
Везде неправедная Власть
В сгущенной мгле предрассуждений
Воссела—Рабства грозный Гений
И Славы Роковая страсть».

**(«Вольность».)**

З абурэннем Пушкін гаворыць і аб вялікасвецкім грамадстве — пустым, разбэшчаным, прадажным і бязлітасным да народа. Паэт не можа знайсці сабе месца сярод гэтага грамадства. Ён рвецца на прастор палёў, да свабоды ад ланцугоў бліскучага, але пустога і душнага свету сталіцы. Аднак і там ён не знаходзіць жаданай свабоды. Замест «довольства и труда» вясковага жыцця, паэт бачыць жудасныя малюнкі «неумолимого рабства».

«Здесь барство дикое, без чувства, без закона,
Присвоило себе насильственной лозой
И труд, и собственность, и время земледельца...»

**(«Деревня».)**

Але Пушкін, як геніяльны мастак, прадбачыць і верыць, што «души прекрасные порывы» прынясуць

перамогу, ён верыць у новую «звезду пленительного счастья».

«Товарищ, верь: взойдет она,
Звезда пленительного счастья,
Россия вспрянет ото сна,
И на обломках самовластья
Напишут наши имена!»

—гаворыць Пушкін у вядомым вершы «К Чаадаеву», аднаму з удзельнікаў паўстання дзекабрыстаў.

Геніяльная прадбачлівасць Пушкіна і яго непахісная вера ў надыход лепшага жыцця, у «звезду пленительного счастья», абумовілі тую энергію, з якой ён услаўляў свабоду і выкрываў парок.

Царызм не мог даравацъ Пушкіну яго свабодалюбівых імкненняў і выслаў паэта ў 1820 годзе з Пецярбурга на поўдзень. Але і гэта не зламала палымянага трыбуна свабоды. Будучы на поўдні, спачатку ў Екацерынаслаўлі, затым на Каўказе, у Кішынёве і, нарэшце, у Адэсе, Пушкін наладжвае сувязь з прадстаўнікамі Паўднёвай групы дзекабрыстаў. Яны сваім уплывам узмацнілі пазіцыі паэта як змагара за палітычную свабоду супроць царскай рэакцыі.

Сярод твораў гэтага часу мы знаходзім і эпіграмы на кішынёўскую і адэскую надзённасць і гімны змагарам з тыраніяй, і заклік да паўстання, і водгукі на сусветныя праблемы, і любоўныя вершы і, нарэшце, вялікасныя гімны прыродзе. І праз усе гэтыя творы праходзіць пратэст супроць беспрасветнай рэчаіснасці, мары аб свабодзе і вера ў жыццё і прагрэс.

Сцвярджаючы непазбежнасць свабоды, паэт бязлітасна выступае супроць царызма. Ён піша цэлы рад эпіграм на Аляксандра І і другіх вядомых у той час дзяржаўных дзеячоў—прыхільнікаў самаўладства.

Поруч з гэтым Пушкін напісаў за гэты-ж перыяд паэмы «Кавказский пленник», «Братья-разбойники», «Бахчисарайский фонтан», «Цыганы».

Царскі ўрад, каб ізаляваць паэта ад грамадства, высылае Пушкіна ў 1824 годзе ў глухое сяло Міхайлаўскае пад нагляд мясцовых уладаў. Адзінокі, адарваны ад свету, сам-на-сам са сваёй старой нянькай Арынай Радыёнаўнай, паэт прабыў у Міхайлаўскім да 1826 года.

За гэты перыяд ім напісаны «Борис Годунов», цэнтральная частка рамана «Евгений Онегин», рад лірычных вершаў, эпіграм і іншыя творы.

Прабыванне Пушкіна ў Міхайлаўскім не дазволіла яму прыняць непасрэдны ўдзел у паўстанні дзекабрыстаў.

Пасля паражэння гэтага паўстання і смерці Аляксандра І новы цар Нікалай І дазволіў з 1826 года жыць Пушкіну ў Маскве. Гэтае вызваленне паэта з ссылкі, па сутнасці было горшай няволяй. Паэт знаходзіўся пад строгім наглядам тайнай паліцыі і без дазволу самога цара не меў права нікуды выязджаць і друкаваць свае творы. Спробы царызма перацягнуць Пушкіна на свой бок не мелі поспеху. Паэт заставаўся верны прынцыпам дзекабрыстаў. Аб гэтым сведчаць яго творы, напісаныя ў Міхайлаўскім, і асабліва верш «Андрэ Шэнье», за які Пушкін быў прыцягнуты да адказнасці. Аб гэтым сведчаць і вершы, прысвечаныя дзекабрыстам і напісаныя пасля паражэння паўстання — «Арион», «Во глубине сибирских руд», «19 октября 1827 г.» і інш.

У гэтых творах Пушкін гаворыць, што і пасля гібелі рэвалюцыйнага «челнока» ён будзе спяваць гімны свабодзе. Ён верыць, што справа дзекабрыстаў не загіне і хутка настане такая пара, калі

«Оковы тяжкие падут,
Темницы рухнут, и свобода
Вас примет радостно у входа,
И братья меч вам отдадут».

Такім чынам, надзеі цара на «прымірэнне» з мяцежным паэтам не апраўдаліся. Пушкін не мог пераступіць той бездані, якая адлучала яго прагрэсіўныя імкненні ад рэакцыйнай праграмы царскага самаўладства. Варожыя адносіны Пушкіна да царызма выявіліся ў гэты час у такіх творах, як «Анчар», «Дар напрасный, дар случайный», «Три ключа» і інш.

Супроць царызма, па сутнасці, накіраваны і вялікі драматургічны твор—трагедыя «Борис Годунов», у якой паэт гаворыць, што тварцом гісторыі з'яўляюцца не цары, а народ.

Думку аб тым, што залогам вялікасці і росквіту краіны з'яўляецца адзінства народа, Пушкін праводзіць і ў паэмах «Полтава» і пазней у «Медным всаднике». У паэме «Полтава» з асаблівай сілай праявіліся патрыятычныя настроі паэта, яго любоў да Расіі, якую ён так поўна і ярка прадставіў у рамане «Евгений Онегин».

«Евгений Онегин» быў закончаны Пушкіным у 30-х гадах. У гэтыя-ж гады ім напісаны, апрача вялікага цыкла вершаў, «Домик в Коломне», «Скупой рыцарь», «Моцарт и Сальери», «Пир во время чумы», «Дон Жуан», серыя празаічных апавяданняў «Повести Белкина», «История села Горюхина» і інш. Але найбольш шырокі і праўдзівы рэалістычны паказ тагачаснага жыцця, безумоўна, дадзены ў рамане «Евгений Онегин».

За ідэалы лепшага грамадскага ладу Аляксандр Сяргеевіч Пушкін змагаўся ў сваёй творчасці ўсё сваё жыццё. І не выпадкова, што пад канец жыцця, у 30-х гадах Пушкіна ўсё больш і больш цікавяць простыя маленькія людзі, у якіх ён бачыць у першую чаргу не раба, а чалавека. Характэрным творам у гэтым сэнсе з'яўляецца аповесць «Капитанская дочка».

У цэнтры аповесці гістарычны момант — паўстанне Пугачова. Пугачоў, кіраўнік сялянскага руху, паказаны Пушкіным глыбока чалавечным. Ён смелы, разумны і высакародны. Ён умее плаціць дабром за дабро. Гэтае ўсведамленне чалавечай годнасці праходзіць праз усе вобразы аповесці. Пушкін сцвярджае, што паўстанне і абурэнне сялян—законная з'ява. Яна выклікана жорсткасцю дваран, прыгнечаннем і зняважай чалавека.

Пушкін нязменна змагаўся супроць царскага ўціску, за свабоду, справядлівасць і чалавечую годнасць. Ён праўдзіва і глыбока адлюстраваў у сваёй творчасці жыццё свайго часу. У яго асобе мы маем геніяльнага мастака, які выступіў як барацьбіт за лепшыя ідэалы, як прыхільнік свабоднага гарманічнага развіцця чалавека. Вось чаму яго творы будуць вечна жывымі.




Павел **КАВАЛЁЎ**

(Урывак з аповесці «Андрэйка»)

Мал. **Н. ГУЦІЕВА.**

Зінаіда Антонаўна рупліва рыхтавала Андрэйку паесці. Адначасова ў яе галаве склаўся рызыкоўны, але не беспадстаўны план. Непакоіла больш за ўсё андрэйкава становішча, бо яно-ж бадай што больш адказнае, чым яе, выканаўцы сваёй задумы. Ад Андрэйкі залежыць усё. Зінаіда Антонаўна, здаецца, старэй стала за гэтыя некалькі хвілін, бо на ілбу выразна акрэсліліся тры шырокія маршчыны, а вочы нібы счарнелі больш, чым былі да гэтага.

Андрэйка вызначаўся дасціпнасцю і не па гадах вялікай назіральнасцю. Таму твар мацеры, які ён убачыў, як толькі прачнуўся, яму пра многае гаварыў; сэрца яго дзіцячае адчула штосьці нядобрае. Скочыўшы з ложка, Андрэйка ўбачыў, што на двары,—пад акном іхняй хаты,—немцы. Так блізка яшчэ ніводнага разу Андрэйка не бачыў немцаў. Сон дзіўны, твар мацеры, немцы ля цябе,—усё гэта адразу звалілася на малога. Усяго гэтага для дзіцяці многа, каб хутка агледзіцца, разабрацца ва ўсім як належыць. Андрэйка стаяў у нерухомасці.

— Мыйся, сынку, і сядай снедаць,—пачуўся зусім спакойны і ласкавы голас мацеры.

Андрэйка ведаў, што маці ведае лепш за каго, калі і што сказаць, таму, не спяшаючыся з пытаннямі, пачаў мыцца.

А немец, што бліжэй за ўсіх стаяў да акна і бесаромна назіраў за кожным рухам Зінаіды Антонаўны, падрад некалькі разоў пастукаў у шыбу, даючы гэтым ведаць, што чакае гаспадыню хаты, патрабуе, каб хутчэй яна выходзіла.

Кожны гэты стук у акно ў андрэйкавым сэрцы адбіваўся пякучым болем, думка паласнула мозг: «няўжо маці ў небяспецы». Хлопчык, ледзь сцёршы ручніком ваду з твару, пайшоў да стала, дзе маці ставіла яму зусім поснае снеданне—адвараную бульбу. Андрэйка зразумеў, што маці дала-б можа што іншае да бульбы, але-ж немец гэты—хударлявы і як бусел даўгі—беспеперапынна глядзіць у акно, сочыць за ўсім.

— Мама...

Зінаіда Антонаўна пачула слова сына. І здалося ёй, што гэтае слова яна пачула ўпершыню. У гэта слова Андрэйка ўклаў усё, што мог укласці ў такім становішчы, і яно прагучэла і велічэзным пытаннем, і праклёнам суроваму часу, і вялікаснай любоўю да мацеры, і трывогай за яе...

— Ні слова сынку не пытайся... Я пайшла, а ты з'еш усю бульбу, і там...

Яна не скончыла фразы, бо нельга было болей гаварыць, каб не выклікаць падазронасць стаяўшага ля акна немца.

Андрэйка абеируч схапіў міску з бульбай і палез за стол. А Зінаіда Антонаўна ўсміхнулася яму, дакранулася яго бялявых мяккіх, як лён, валасоў і, глыбока зірнуўшы ў вочы сына, вышла з хаты. Андрэйка пачуў як ляснуліся жалезкі і трэснуў аб клямку замок. Маці замкнула яго, а сама пайшла. Куды?

Двойчы Андрэйка хадзіў у лес да дзядзькі Марціна і заносіў яму пісьмы ад мацеры, змест якіх маці заўсёды яму пераказвала. А сёння такая таямніца, што лоб хоць трэсні, а ўразумець, што робіцца, нельга. Андрэйка заўважыў праз акно, што немцы пайшлі праз вёску следам за маці, і без усялякай насцярожанасці, хутка пачаў выкідаць бульбу з шырокай глінянай міскі. Бульба была добра вывараная, таму кожная бульбіна рассыпалася ў руках Андрэйкі, што замаруджвала яго работу. Тады абеируч ён хапіў міску і перакуліў яе на стол. Моцна згорнуты кавалак паперы быў адразу-ж заўважаны.

— Тое і ёсць—«там на дне», што толькі і паспела сказаць маці,—акрэсленая думка асвятліла Андрэйку.

Аглядаючыся па баках праз вокны, ён адсунуўся ў цёмны вугал і разгарнуў паперку. А ў ёй было:

«Дзядзька Марцін!

Вяду да цябе адзінаццаць фрыцаў—збіліся з дарогі і хочуць быць у мястэчку Курган... Сустракай на грэблі, лепей на кладках, што вядуць з Дальняга лесу ў Вялікі мох—на Іпуці...

Зінаіда».

Андрэйка адразу зразумеў як яму дзейнічаць. Трэба было ні хвіліны не марудзіць. Андрэйку нібы

сэрца хто сціснуў, як падумаў ён толькі пра тое, што маці яго цяпер у найвялікшай небяспецы. Мо' таму яна толькі адзін раз неяк своеасабліва Андрэйку ўсміхнулася і адзін раз дакранулася яго валасоў?

— Хутчэй, хутчэй, хлопча,—як з затоенага куточка шапталася Андрэйку. — Хутчэй бегчы да дзядзькі Марціна, бо толькі ён выратаваць можа яго, андрэйкаву любую маці, ён можа злажыць галовы немцаў з аўтаматамі, ён, ён... і ўсё пачыналася зноў узнікаць з самага пачатку.

Хутка апрануўшыся і заціснуўшы ў камяку паперку да дзядзькі Марціна, Андрэйка скочыў на прыпечак, затым на печку і, натужыўшыся галавою, узняў адну дашчэчку, а потым другую, і юркнуў праз зробленую шчыліну на дах.

... — Што з Андрэйкам? Ці паспее ён да дзядзькі Марціна?

Гэтыя пытанні ўвесь час хвалявалі Зінаіду Антонаўну да знямогі. За час доўгага паходу яна да драбніц прадумала ўсё сваё жыццё, свае ўчынкі. Тое, на што рашылася яна вось сёння, вырысоўвалася разумным, выключна патрыятычным. І яна не так хвалявалася і не так многа думала пра сябе, пра свой асабісты лёс у гэтай аперацыі, як пра гэтых адзінаццаць немцаў. Было-ж такое прагнае і нясцерпнае жаданне звесці іх са свету. Ёй здавалася, што, быццам знішчыўшы гэтых адзінаццаць прыблудных пачвар, яна знішчыць усю нямецкую саранчу, што топча яе зямлю і глуміцца над усім жывым.

Зінаіда Антонаўна ішла цвёрдым крокам насустрач падзеі, вяла праз хмызнякі і балотныя мясціны групу немцаў да месца размяшчэння партызанскага атрада.

Зрабіўшы значны поўкруг ускрайкамі лесу і паказваючы таму высокаму немцу, што прайсці напрамік інакш, чым яна вядзе, немагчыма, Зінаіда Антонаўна адцягвала далей і далей час падыходу да грэблі. Яна вельмі-ж глыбока захоўвала сваё ўнутранае пачуццё.

Нарэшце спыніліся, і немец загадаў Зінаідзе Антонаўне прысесці адпачыць. Тая паслухалася. Немец загаварыў .

— Мы растраляйт вас як не будзем вечарэ на месцы.

— А навошта палохаць, давайце пайшлі, каб паспець, і Зінаіда Антонаўна прыўзнялася на ногі і сваёй гатоўнасцю зноў дала зразумець немцам, што яна бездакорна да іх.

Высокі худы немец таксама ўстаў. Вочы яго праніззвалі наскрозь Зінаіду Антонаўну, і здавалася, ён гатоў быў схапіць яе за горла і ад злосці за сваё становішча грызці, смактаць кроў яе. Але зважаючы на тыя абставіны, што ў месцах, дзе ён знаходзіцца апошнія месяцы, уся мясцовасць вельмі-ж непраходная, балоцістая і бадай што няма на каго злаваць за гэта,— супакоіўся і пакарыўся лёсу. Астатнія-ж немцы, як па камандзе, трымаліся так, як іх старэйшы.

Ішоў час і набліжалася месца, дзе працякала Іпуць. Зінаіда Антонаўна ўзяла крыху ўлева, каб затым, дайшоўшы да ракі, прайсціся ўздоўж яе колькі сот метраў і гэтым зрабіць водчнасць, што і яна-то не вельмі добра ведае дарогу і вось не трапіла адразу на грэблю. А другая, і бадай больш кемлівая развага, падказвала гэта зрабіць для таго, каб паказацца партызанам Марціна з гэтага боку, бо калі з Андрэйкам што-небудзь здарылася, тады для іх уся яе задзея не будзе вядомай, і вось як убачыць з таго берага яе і немцаў, дык, пакуль узыйду на грэблю, у саміх рашэнне саспее.

Была і зацэпка за тое, што сапраўды, непадалёку ёсць хутары, да якіх, калі ісці напрамік, за поўгадзіны паспець можна. Але... але няможна-ж паверыць, што Марцін у гэтыя хвіліны спіць і нічога не робіць. Андрэйка... і думка абарвалася. Пад нагамі Зінаіда Антонаўна ўбачыла тую самую чорную яміну, прайсці якую трэба з асцярожнасцю.

А вакол стаяла дзівосная цішыня. Нібы ўсё схавалася раней сонца за край небасхіла і знаходзіцца ў стане магутнай дрымоты. І толькі з-пад чыіхсьці ботаў адляцеў кавалак засохлай гразі і бульхнуў у ваду. Ціхі ўсплёск абудзіў таямнічую маўклівасць.

Зінаіда Антонаўна лоўка пераступіла яміну і наблізілася амаль да самае спіны доўгавязага немца, што ішоў наперадзе і чамусьці замарудзіў крокі. І ў гэтую-ж хвіліну грымнулі некалькі стрэлаў, ад якіх пад сэрцам Зінаіды Антонаўны нешта трэснула, і толькі праз нейкі туман яна заўважыла як доўгавязы немец бокам павярнуўся да яе і з узнятай рукой паляцеў у раку. Што было ззаду—яна не бачыла і больш нічога не запомніла.

**(Працяг будзе.)**



# Аб фізічным выхаванні дзяцей у сям'і

**В. ЯКАЎЛЕЎ**

Спачатку—аб маіх добрых знаёмых па дому рэбятах.

Пеценька... Вечна закутаная, павязаная шарфамі і кашнэ, нясмелая і кволая васьмігадовая істота. Раўніва аберагаецца хатнімі «ад усялякіх фізкультур». Яму «здабылі» запіску ад урача аб вызваленні ад урокаў фізічнай культуры ў школе.

Для Пеценькі ўсё пад забаронай: і «ганяцца за мячом», і бегаць на каньках, і хадзіць на лыжах: «таго і глядзі прастудзіцца або паб'ецца, ды яшчэ сэрца папсуе»... або: «ведаем мы гэтыя канькі!..»

Часам, бывае, Пеценьку адпускаюць «пагуляць на дворык». Падзея гэта становіцца вядомай усім жыхарам кватэры: пачынаецца «ўпакоўка» Пеці ў «сем адзёжак», суправаджаемая бясконцымі ўнушэннямі: «не гуляй з хлопчыкамі», «адчуеш, што спацеў, ідзі хутчэй дамоў», «я з акна ўсё бачу» і т. д. Зразумела, што Пеценька і на самой справе баіцца «ўвязвацца» ў дружныя гульні рэбят. Але пагуляць яму хочацца. Ён нясмела топчацца вакол ігракоў, смешна размахвае рукамі, але сам уступіць у гульню не адважваецца і толькі з зайздрасцю любуецца ёю. Гляджу на Пеценьку, і становіцца шкада мне яго. Задумваюся: ці не таму ён расце капрызным, спеставаным дзіцем, часта хварэе, няважна вучыцца ў школе, што бацькі, якія ўсю душу аддаюць свайму любімцу, недаацэньваюць важнасці правільнага фізічнага выхавання хлопчыка? Бадай, гэта так.

Вось пара—Жэня і Оля. Бацькі іх культурныя людзі, але яны не займаюцца фізічным выхаваннем сваіх дзяцей. Між тым Жэня, захапляючыся футболам «ад зары да зары», яўна шкодзіць свайму здароўю. Да таго-ж, гуляючы без нагляду ў «дзікіх» футбольных камандах, ён паспеў навучыцца грубасці, разбэшчанасці, пачаў курыць, падражаючы манеры аднаго з «чэмпіёнаў» вулічнага футбола. Жэні сумна на ўроках фізічнай культуры ў школе, дзе патрабуецца дысцыпліна, ды і ў футбол не гуляюць. З урокаў ён уцякае, але, лічачы сябе фізкультурнікам, носіць чужы значок БГПА.

Оля ўзялася было рабіць раніцамі зарадку, але не сустрэла заахвочання з боку мамы. А адзін раз мама нават пакрыўдзіла Олю сваім раздражыцельным тонам, і цяпер Оля ні за што не хоча рабіць зарадку.

Неўмяшанне бацькоў у справу фізічнага выхавання Жэні і Олі прыкметна адбіваецца не толькі на здароўі і фізічным развіцці, але і на іх поспехах і паводзінах.

А вось яшчэ тройка—Ніна, Валя і Ігарок—рэбяты, на якіх люба-дорага паглядзець. Іх маці—часты госць у школе, дзе вучацца яе дзеці. Яна, па парадзе школьнага выкладчыка фізкультуры і ўрача, набыла кніжку «Зарадка для дзяцей», сама развучыла з рэбятамі зарадку і цяпер назірае за тым, каб кожную раніцу ўся яе «каманда» «заражалася». Зімой мінулага года ў нядзельныя дні я нярэдка сустракаў маці з усім яе «патомствам» на лыжных прагулках.

Ніна, Валя і Ігарок штодзённа, ва ўстаноўленыя свабодныя гадзіны, гуляюць і іграюць у двары. Іх пытаюць дома: што рабілі? У якія гульні гулялі? А то і сама маці выйдзе ва двор паглядзець на сваіх рэбят.

Ніна і Валя любяць гуляць у лапту, у мяч, Ігарок захапляецца гімнастыкай. Усе трое запісаны ў школьны гурток фізкультуры і акуратна наведваюць яго.

Любяць рэбяты і фізічную працу. Яны то дроў прынясуць, то падлогу памыюць. Ім не страшна «спацець», «прамачыць ногі». Яны не баяцца адкрытых фортак, скразнякоў.

* * *

Фізічнае выхаванне Ніны, Валі і Ігарка ў сям'і—добры прыклад для многіх бацькоў. Калі бацькі будуць уважліва адносіцца да арганізацыі фізічнага выхавання сваіх дзяцей, яны неўзабаве ўбачаць станоўчыя вынікі сваіх клопатаў: дзеці і вучыцца стануць лепш, і расці будуць моцнымі, здаровымі, лоўкімі, сільнымі—такімі, якімі хоча іх бачыць наша Радзіма. Але для гэтага трэба раз і назаўсёды адмовіцца ад усё яшчэ распаўсюджанага ў нас погляду на фізкультуру, як на нейкі дакучлівы прыдатак да «асноўных» школьных заняткаў, і зразумець, урэшце, што культура цела і яго развіццё не толькі не перашкаджаюць, але магутна садзейнічаюць разумоваму развіццю і маральнаму выхаванню дзяцей.

Тут мала «ў прынцыпе» прызнаць важнасць фізічнага выхавання,—трэба сістэматычна і няўхільна клапаціцца аб ім.

Між тым, ці многія бацькі звяртаюць увагу на адзнаку па фізічнай культуры, якую кожную чвэрць прыносяць дзеці дамоў? А адзнакі-ж гэтыя гавораць аб тым, як паспяваюць рэбяты ў занятках гімнастыкай, лыжным спортам, гульнях. Калі ў чацвяртной ведамасці сына або дачкі бацькі ўбачаць дрэнную адзнаку,—гэта павінна іх занепакоіць. Ім трэба, не адкладаючы, высветліць у школе прычыны адставання і, калі спатрэбіцца, дапамагчы сыну або дачцы ў вольны час трэніравацца ў тым практыкаванні, па якому яны адсталі.

Нядаўна на адным бацькоўскім сходзе мяне запыталі: «Ці павінны дзеці штодзённа займацца зарадкай дома, калі яны кожны дзень робяць гімнастыку перад урокамі ў школе?»

Хатняя зарадка і трэніроўка да ўрокаў у школе—рэчы розныя, і адна ніяк не можа замяніць другую. Вельмі важна для здароўя як рабіць зарадку дома, так і выконваць штодзённую школьную гімнастыку перад урокамі.

* * *

У дзяцей, апрача школы, падрыхтоўкі ўрокаў, дапамогі па гаспадарцы, чытання і іншых заняткаў, заўсёды павінен знайсціся час для рухавых гульняў і фізічных практыкаванняў.

Вельмі важна, каб у гульнях і занятках фізкультурай было пабольш рознавіднасці: гэта неабходна для рознабаковага фізічнага развіцця і правільнага фарміравання арганізма дзіцяці. Калі, напрыклад, вы ведаеце, што ў школьных занятках Ніна захапляецца гімнастыкай, то дома зацікаўце яе летам—плаваннем, зімой—лыжамі, канькамі і г. д. Калі Валя—«невыправімы футбаліст», то, не робячы для яго з футбола «забароненага плода», пастарайцеся зацікавіць яго гарадкамі і іншымі гульнямі.

* * *

Вы падарылі свайму Валі або Віці лыжы. Але не лічыце, што на гэтым ваш абавязак па выхаванню юнага лыжніка заканчваецца. Неабходна асабістае назіранне за заняткамі вашага дзіцяці лыжным спортам і такая іх арганізацыя, пры якой гэтыя заняткі прынясуць яму карысць.

Ваша дзіця здаровае, але вы ідзеце з ім да ўрача. У гэтым няма нічога дзіўнага. Вы пытаеце ўрача, якія віды спорта, якія гульні могуць быць рэкамендаваны вашаму дзіцяці, улічваючы стан яго здароўя, колькі часу яму можна знаходзіцца на катку, на якую дыстанцыю хадзіць на лыжах і т. д.

* * *

Калі вы не хочаце страціць зімовую пару для ўмацавання здароўя рэбят, дапамажыце ім у вольны час заняцца спортам.

Лыжы—адзін з каштоўнейшых відаў зімовага спорта. Перасоўванне на лыжах на чыстым зімовым паветры ўмацоўвае здароўе. Робячы лыжныя прагулкі, дзеці становяцца больш загартаванымі, смелымі, вынослівымі, лоўкімі.

Да выбару спартыўнага інвентару і першапачатковага навучання аднясіцеся з усёй сур'ёзнасцю. І тое, і другое вельмі важна.

Так, напрыклад, купляючы дзецям лыжы, звярніце ўвагу на тое, каб даўжыня іх адпавядала росту дзіцяці, каб дзіця лёгка магло дастаць пальцамі да канца вертыкальна пастаўленай побач лыжы. Лыжы выбірайце без сучкоў. Прыклаўшы адна да адной скальзячыя паверхні абодвух лыж, праверце, ці не пакароблены яны. Затым праверце, ці гнуткія лыжы, асабліва ў насавой частцы; ці ёсць у іх дастатковы прагіб у тым месцы, дзе прыходзіцца пляцоўка для нагі. Пакладзіце лыжу на ўказацельны палец тым месцам, дзе прыходзіцца прорэзь для высокага рэменя: насковы канец лыжы павінен апускацца ўніз. Да лыж набудзьце палкі крыху вышэй плеч лыжніка і два—тры кавалкі лыжнай мазі.

Навучанне хадзьбе на лыжах трэба пачынаць з перасоўвання без палак (хадзьба па роўнай мясцовасці, скатванне з горак). Калі перасоўванне без палак дастаткова асвоена, можна вучыцца хадзіць на лыжах пры дапамозе палак, ужываючы апошнія для адштурхвання, чым дасягаецца больш хуткі ход. Аднак важна даць зразумець пачынаючаму лыжніку, што галоўную работу пры хадзьбе на лыжах выконваюць ногі, а не рукі. Нельга «віснуць» на палках. Рэбяты павінны практыкавацца ў шырокім скальзячым кроку, у паваротах, скатваннях з горак і пад'ёмах на схілы.

Трэба прывучаць рэбят перасоўвацца не толькі па гатовай лыжне, але і па цаліне; паказваць ім, як можна «паўзці» на лыжах, праходзіць пад галінкамі дрэў, не стрясянуўшы з іх снегу, абыходзіць дрэвы на спуску гары, блытаць сляды і г. д.

У сельскіх умовах добра выкарыстаць магчымасць пераходу рэбят у школу і дамоў на лыжах.

* * *

Цяпер аб каньках. Катацца на каньках могуць нават маленькія школьнікі-першакласнікі. Самыя зручныя канькі для пачынаючых—«Снягурачка» або «Англійскі спорт», калі астрыё канька будзе акругла сточана. Першыя спробы «хадзьбы» на каньках лепш рабіць па драўлянай падлозе (надзеўшы на лёзы чахлы з тканіны). Затым можна паспрабаваць выйсці на шчыльны снег. Спачатку пачынаючаму канькабежцу лепш аказаць падтрымку (трымаць яго за руку). Вельмі важна навучыцца, адштурхоўваючыся пачаргова то адной, то другой нагой, пераносіць цяжар цела на апорную (скальзячую) нагу, крыху пры гэтым падаючы тулава ўперад. Калі канькабежац здолее ўжо самастойна выконваць скальжэнне па снегу, магчым першы выхад і на лёд, таксама спачатку з падтрымкай вопытнага канькабежца. Пасля некалькіх наведванняў катка ваш вучань будзе ўжо самастойна ўдасканальвацца ў бегу, паваротах, тармажэнні і да т. п.

Наведванне катка не павінна заставацца бескантрольным з боку бацькоў. Устанавіце пэўныя тэрміны для катання, сачыце за тым, каб нашы канькабежцы прытрымліваліся іх, раскажыце ім, як лепш размяркоўваць час на катку.

Прыкладным рэжымам для прабывання дзяцей на катку можа быць наступны.

Практыкаванні ў бегу па прамой—15—20 мінут. Адпачынак у памяшканні—5—10 мінут.

Практыкаванні ў паваротах, тармажэнні—15—20 мінут. Адпачынак у памяшканні—5—10 мінут.

Гульні, фігуры на каньках—15—20 мінут. Адпачынак ў памяшканні—5—10 мінут.

Спакойнае катанне па кругу, уход з катка—10—15 мінут.

Усё прабыванне на катку не павінна перавышаць адной—паўтары гадзіны. Лепшая тэмпература паветра для катання на каньках—ад 2—3 да 15°.

* * *

Нарэшце аб санках. Катанне з гор на санках — карысная і захапляючая зімовая забава.

Асноўнае значэнне санак, як сродку фізкультуры, заключаецца не толькі ў неаднаразовых узыходжаннях на горку з санкамі (што садзейнічае ўмацаванню сэрца і лёгкіх), але і ў тым, што, з'язджаючы з горкі, рэбяты могуць прарабіць многа дадатковых практыкаванняў, выхоўваючых у іх лоўкасць, адвагу, рашучасць (падбіранне па шляху скатвання загадзя пакладзеных прадметаў; скатванне на санках, седзячы спіной уперад: пападанне снежкамі ў цэль пры праездзе міма яе і да т. п.).

Назіраць за катаннем дзяцей на санках неабходна з вяршыні горкі, адначасова сочачы за тым, каб адлегласць паміж санкамі, якія скатваюцца, была не менш 6—8 метраў. Трэба забараняць пераходзіць папярок скату з горкі ў часе катання. Вельмі працяглае прабыванне рэбят на горцы дапускаць не варта. Калі, напрыклад, на працягу гадзіны кожнаму прадаставіцца магчымасць раз 20—25 скаціцца з горкі, а значыцца, і падняцца на горку з санкамі, то такую нагрузку можна лічыць зусім дастатковай. Лепшая тэмпература для заняткаў на горцы ад 2—3 і да 10—12°.

* * *

Мы прывялі вышэй парады бацькам па арганізацыі асобных відаў дзіцячага спорта. Зрабілі мы гэта з мэтай падкрэсліць усю важнасць пільнай увагі і сістэматычных клопатаў сям'і аб правільным фізічным выхаванні дзяцей — верным залогу іх цяласнага і душэўнага здароўя.



# Гігіена цяжарнай жанчыны

Прафесар **Г. ДАЗОРЦАВА**

Ва ўсім арганізме жанчыны з наступленнем цяжарнасці адбываюцца вялікія змяненні. Перад арганізмам у гэты час паўстаюць новыя важныя задачы. З аднаго боку, неабходна зародак вырасціць і давесці да сталага стану. З другога боку, арганізму трэба падрыхтавацца да родаў і кармлення дзіцяці грудзьмі пасля родаў.

Перш за ўсё з наступленнем цяжарнасці спыняюцца месячныя. Калі паяўляюцца крывяністыя выдзяленні ў цяжарнай жанчыны, гэта заўсёды ўказвае на якую-небудзь няправільнасць цяжарнасці. У гэтых выпадках жанчына павінна безадкладна звярнуцца да ўрача.

У часе цяжарнасці ў многіх жанчын бывае расшырэнне вен на ўнутранай частцы бёдзер, а таксама на нагах. Пры расшырэнні вен трэба туга бінтаваць ногі шырокім бінтам знізу ўверх. У першы раз акушорка або сястра павінна паказаць, як накласці такі бінт; яго можна падрыхтаваць з палатна. Апрача таго, рэкамендуецца, лежачы на ложку, выцягнуць ногі кверху. Тады кроў адлівае ад вен, і жанчыне робіцца значна лягчэй.

Клопаты аб штодзённым дзеянні кішэчніка складаюць адно з важнейшых правіл гігіены цяжарных жанчын. Для гэтага ў большасці выпадкаў дапамагаюць наступныя простыя сродкі: прастакваша, сырыя фрукты, асабліва адно—два яблыкі, з'едзеныя нанач, гародніна, шклянка астуджанай гатаванай вады, выпітай наташчак.

Грудзі ў цяжарнай жанчыны з другога месяца цяжарнасці пачынаюць набухаць, значна павялічвацца ў аб'ёме. Яны нібы падрыхтоўваюцца для кармлення будучага дзіцяці. Павялічваюцца грудныя саскі і робяцца вельмі чуллівымі пры датыканні. Вакол груднога саска ўтвараецца цёмны кружочак.

Шкодна насіць аддзенне, якое шчыльна абхватвае грудзі. Яно перашкаджае свабодна развівацца грудным залозам.

Скура саскоў вельмі далікатная. Яна лёгка пашкоджваецца дзіцем у часе яго кармлення. Пры гэтым утвараюцца ссадзіны і драпіны. Праз гэты пашкоджаныя месцы скуры мікробы пранікаюць у глыбіню грудных залоз, ад чаго развіваецца запаленне іх. Ні ў якім выпадку нельга расціраць саскі спіртам. Таксама не трэба ўжываць мазь. Ніякая асаблівая падрыхтоўка саскоў не патрэбна, апрача захоўвання іх у чыстаце. Добра ўжо з сёмага месяца цяжарнасці ўкладваць у ліфік да саскоў кавалачак простага палатна, складзенага ў чатыры столкі.

У некаторых жанчын саскі бываюць вельмі кароткія, або плоскія. Часам яны нават уцягнуты. Такія саскі дрэнна захватваюцца дзіцем. Кармленне становіцца цяжкім. У гэтых выпадках неабходна звярнуцца ў кансультацыю за парадай.

У здаровых жанчын у часе цяжарнасці апетыт у большасці паляпшаецца, але ў іншых пагаршаецца. Часам цяжарныя жанчыны адчуваюць млоснасць, якая можа скончыцца рвотамі, што часцей бывае ў першацяжарных. Звычайна млоснасць бывае раніцай. Таму лепш за ўсё паесці зранку, лежачы ў ложку, і паляжаць поўгадзіны, а тады ўжо прымацца за работу. Калі рвоты паяўляюцца на працягу дня, пасля прыёму ежы, то трэба есці пакрыху, але часцей. Пасля ежы лепш унікаць цяжкай работы, хуткіх і рэзкіх рухаў. Ад ежы, якая выклікае млоснасць і рвоты, неабходна на некаторы час зусім адмовіцца. Ніякіх лякарстваў супроць рвоты прымяняць не трэба, яны праходзяць самі па сабе.

Часам звычайныя рвоты пераходзяць у «няспынную» рвоту, тады неабходна легчы ў больніцу.

Цяжарнасць уплывае і на такія важныя для жыцця органы, як сэрца і почкі. У часе цяжарнасці работа гэтых органаў павялічваецца. Калі жанчына хварэе сэрцам або почкамі, то дзейнасць іх у часе цяжарнасці расстрайваецца. Асаблівую ўвагу трэба звяртаць на паяўленне ацёкаў. Невялікія ацёкі ля ладыжак бываюць і ў здаровых жанчын пры правільнай цяжарнасці. Больш значныя ацёкі ног і жывата ўказваюць на расстройства ў дзейнасці сэрца і почак. У цяжарных пры пад'ёмах бывае невялікая адышка. У хворых сэрцам адышка бывае мацней і заўважаецца пры хадзьбе нават па роўнаму месцу.

Пры ацёках у цяжарных неабходна значна зменшыць колькасць піцця. Каб не адчуваць смагі, цяжарная з ацёкамі павінна адмаўляцца ад салёнай і тлустай ежы, узбуджаючай смагу. У такіх выпадках лепшым харчаваннем лічыцца малако. Калі ацёкі не пройдуць ад змены харчавання праз некалькі дзён, то неабходна звярнуцца да ўрача. Наогул паяўленне ацёкаў і адышкі патрабуе большай увагі. Пры гэтым заўсёды трэба звяртацца да ўрача.

Цяжарнасць—не хвароба. Наадварот. Мацярынства добра ўплывае на поўны росквіт сіл і здольнасцей жанчыны. Бясплоддзе-ж указвае на якое-небудзь захворванне жанчыны.

Няправільнасці на працягу цяжарнасці адбіваюцца на плодзе; пры цяжкіх расстройствах плод можа нават загінуць. Гэта бывае, напрыклад, пры хваробах сэрца або почак у цяжарных. Ахоўваючы сваё здароўе, цяжарная ў той-жа час ахоўвае і плод.

Цяжарная зусім не павінна мяняць распарадак жыцця, да якога прывыкла. Але калі яна жыла ў асабліва цяжкіх умовах, то іх трэба палепшыць. Наадварот, калі цяжарная нічога не робіць, многа ляжыць, не бывае на паветры, вядзе нерухомы вобраз жыцця, гэта ёй прыносіць шкоду. Ад такога вобразу жыцця ў жанчыны робіцца бяссонніца, запоры і інш. Гэта вядзе да аслаблення цяжарнай і да вялай родавай дзейнасці. Работа для цяжарнай карысна. Яна выклікае бадзёры настрой, дае добры сон, знішчае запоры.

Але трэба памятаць таксама, што ператамленне, празмернае напружанне сіл, падняцце вялікіх цяжараў могуць прынесці шкоду.

Свежае паветра неабходна для цяжарнай жанчыны. Летам сялянка ў большасці працуе на паветры, а зімой цяжарная жанчына павінна штодзённа праводзіць на паветры 2—3 гадзіны і назіраць за тым, каб і ў хаце было чыстае паветра. Пакой трэба праветрываць некалькі разоў у дзень. Свежае паветра неабходна не толькі для мацеры, а і для правільнага развіцця будучага дзіцяці.

Цяжарныя жанчыны могуць займацца фізкультурай пад кіраўніцтвам урача. У сучасны момант урачэбная гімнастыка для цяжарных жанчын праводзіцца ў жаночых кансультацыях.

Цяжарная жанчына не павінна мяняць звычайнага харчавання. Самай падыходзячай ежай для цяжарных жанчын з'яўляецца раслінная. Трэба ўнікаць множства мясной і тлустай, вельмі салёнай ежы, збытку салодкага. Цяжарная жанчына павінна есці часцей і пакрыху, прычым ежа павінна быць па магчымасці гарачай. Перад пачаткам работы трэба абавязкова паесці.

Піць цяжарнай можна ўдосталь, калі яна здаровая. Піць можна ваду, квас, нямоцны чай, нямоцную каву, малако. Зусім забараняюцца цяжарным усе алкагольныя напіткі: віно, гарэлка, піва і іншыя.

Аддзенне цяжарнай не павінна сціскаць яе рухаў і сціскаць жывата і грудзей. Туга сціскаць спадніцу вакол пояса шкодна.

Нашэнне круглых падвязак, нават гумавых, шкодна; яны выклікаюць застоі крыві ніжэй месца перацяжкі. Ад гэтага ўтвараюцца вузлаватыя расшырэнні вен на нагах. Лепш за ўсё насіць ліфік і прышпіляць да яго спадніцу і даўгія бакавыя падвязкі. Тады увесь цяжар аддзення будзе прыходзіцца на плечы. Зусім добрым аддзеннем з'яўляецца сарафан.

Не рэкамендуецца вельмі ўкутвацца. Цяжарная павінна трымаць у цяпле жывот і ногі. Ахаладжэнне ног можа быць прычынай розных захворванняў—рэўматызма, хваробы почак і т. д. Звычайны абутак—туфлі, боты, валёнкі—зусім падыходзіць для цяжарнай. Шкодным з'яўляецца абутак на высокіх абсацах.

Цяжарныя павінны ўтрымліваць сваё цела ў чыстаце. У першай палавіне цяжарнасці дазваляецца мыцца ў лазні, але парыцца ў вельмі натоп-

ленай лазні шкодна. У другой палавіне цяжарнасці лазняй можна карыстацца толькі з вялікай асцярожнасцю. Калі магчыма, то лепш замяніць лазню цёплым душам. Купацца летам у рацэ або возеры дазваляецца цяжарным, прывычным да такога купання.

Вонкавыя палавыя органы патрабуюць асаблівага догляду. Іх трэба падмываць цёплай вадой. Спрынцавацца сурова забараняецца.

Неабходна захоўваць у чыстаце рот і сачыць за поласцю зубоў. Зубы трэба чысціць наноч шчоткай з зубным парашком. Раніцай паласкаць рот штодзённа цёплай вадой. Яшчэ лепш апаласкваць рот пасля кожнага прыёму ежы, каб астаткі яе не загнівалі ў роце (паміж зубамі). У першыя месяцы цяжарнасці неабходна прывесці ў парадак поласць рота і зубы, для чаго неабходна звярнуцца да зубнога ўрача ў кансультацыю.

У першыя месяцы цяжарнасці жанчынам, у якіх быў выкідыш, трэба ўстрымацца ад палавых зносін. Яйцо ў гэты час яшчэ не дастаткова моцнае.

У апошнія два месяцы цяжарнасці палавыя зносіны зусім недапушчальны. Апрача магчымасці папярэдняга спынення цяжарнасці, у гэты час існуе яшчэ небяспека занесці ў палавыя органы заразу. Навукова ўстаноўлена, што ва многіх выпадках адзінай прычынай цяжкага пасляродавага захворвання (радзільнай гарачкай) было заражэнне, занесенае ў часе палавых зносін незадоўга да родаў.

Па совецкаму закону цяжарная жанчына карыстаецца правам на водпуск да і пасля родаў з захаваннем поўнай зарплаты і дадатковага харчавання.

Працягласць дэкрэтнага водпуску для цяжарных і радзільніц устаноўлена ў 35 дзён да родаў і 42 дні пасля родаў. У вып
у родах або пасляро
пасляродавы водпус
да 56 дзён. Адначас
чынаючы з пятага 
ці і некалькі месяц
атрымліваюць дадатковае харчаванне і перад родамі — камплект прыданага для нованароджанага.

Народавы водпуск мае мэтай даць адпачынак жанчыне, каб яна набралася сіл да прадстаячых родаў. Такі адпачынак мае значэнне і для ўнутранага развіцця плода.

Пасляродавы адпачынак неабходны для таго, каб жанчына аднавіла свае сілы пасля родаў. Пасляродавы адпачынак неабходны і для таго, каб маці магла цалкам аддацца задачы догляду дзіцяці ў першыя тыдні яго жыцця.

---

# Карысныя парады

## ЯК СПЯЧЫ ПІРАГІ З БУЛЬБЫ З КАПУСТАЙ

Узяць паўтара кілограма зваранай бульбы, прапусціць праз мясарубку або цёрку. Затым ½ кілограма сырой бульбы нацерці на тарцы, пасаліць па густу. Добра дабавіць 1 шклянку мукі або поўшклянкі манных круп і 1 яйка. Усю масу добра перамясіць. Вады нельга падліваць, бо вадкасці хопіць ад сырой бульбы.

Начынка прыгатаўляецца так: капусту дробна парубіць, пасаліць крыху, парэзаць 100 грамаў цыбулі, пакласці яе на дно каструлі, уліць крыху масла расліннага, усё гэта паставіць на агонь тушыць пад крышачкай, часцей памешваючы. Калі капуста стушыцца, астудзіць яе. Пячы эканомней вялікім пірагом у духоўцы або ў «цуда-печцы», але можна пячы маленькія піражкі на патэльні, толькі на іх больш масла пойдзе, затое маленькія піражкі прыгажэйшыя і смачнейшыя.

## МЫЦЦЁ ШАРСЦЯНЫХ ПАНЧОХ

Мыць шарсцяныя панчохі лепш за ўсё не мылам, а пакласці іх на ноч у моцны саляны раствор паваранай солі (сталовая лыжка солі на літр халоднай вады). Раніцай выціскаць па некалькі разоў у тым-жа растворы, але не церці. Калі панчохі вельмі брудныя, паўтарыць саляны раствор, а затым прапаласкаць у прэснай халоднай вадзе, пакуль вада не стане чыстай. Пры такім мыцці панчохі ніколі не сядуць і застануцца мяккімі і пушыстымі.

## МЫЦЦЁ НАСАВЫХ ХУСТАК

Насавыя хусткі, асабліва пасля насмарка, кладуцца таксама на ноч у саляны раствор. Раніцай яны лёгка вымываюцца.

## АФАРБОЎКА ЦЫБУЛЯЙ

Для афарбоўкі ў жоўтабронзавы колер панчох, карункаў, цюлевых фіранак, трыкатажу і іншых рэчаў ёсць просты сродак—гэта афарбоўка іх цыбуляй.

Сухую, зусім чыстую верхнюю скурку (шалуху) ад здаровых цыбулін, не паражоных плямамі гнілі, сабраць у марлевую торбачку, завязаць яе і заварыць кіпятком, злёгку націскаючы торбачку драўлянай лапатачкай або лыжкай. Атрымаецца вадкасць густакарычневага колеру. У гэты адвар, выняўшы торбачку, апусціць рэчы, прызначаныя да афарбоўкі, і паставіць таз на пліту, карысінку. Давесці вадкасць да кіпення, памешваючы, каб адвар роўнамерна афарбаваў усе часткі тканіны. У залежнасці ад густаты адвару можна атрымаць розныя адценні, ад цёмнабронзавага да самага светлага.

Выняўшы з поўастыўшага раствору рэчы, не выціскаючы, прапаласкваюць некалькі разоў у халоднай вадзе і, некруцячы іх, закатваюць у чысты холст. Праз некаторы час рэчы распраўляюць і вешаюць для канчатковай прасушкі. Прасуюць рэчы звычайна. Пры мыцці афарбоўка не збягае.

Пры афарбоўцы карункаў, каб яны не выцягваліся і не страцілі сваёй формы, трэба іх сшыць разам паласа з паласой і прасаваць на мяккай падсцілцы праз паперу.

---

**Рэдакцыйная калегія:** А. П. УС (адказны рэдактар), А. І. ФЕДАСЮК, А. Н. ЗАХАРАВА, В. І. ФІЛІПАВА, К. А. АБУШЭНКА, Г. Л. ДАЗОРЦАВА.

Адрас рэдакцыі: Мінск, вул. Карла Маркса, будынак ЦК КП(б) Беларусі. Тэлефон — 93—9—42.
Заказ № 37. Друк. арк. 3 Падпісана да друку 3/II—1947 г.
АТ 01267 Мінск, друкарня імя Сталіна. Пушкіна, 55 Тыраж 10.000 экз. Цана 1 р. 50 кап.
Журнал «Работница и крестьянка» на белорусском языке. Издание ЦК КП(б)Б.

*Няхай жыве*
*магутны Савецкі Саюз,*
*надзейны аплот дружбы,*
*шчасця і славы народаў*
*нашай Радзімы!*
*Няхай жыве вялікі*
*савецкі народ!*